КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №42 (126)
◂ 5 СНЕЖНЯ ◂ 2008 г.

# Новы Час



**УМЕЦЬ ЗНАЙСЦІ СВЯТЛО Ў ЦЕМРЫ**

Стар. 4

**БРАТЫ ШКЛЯЁНКІ: ПА РОЗНЫЯ БАКІ БЕЛАРУСІ**

Сёння на старонках «НЧ» я хачу расказаць пра новыя цікавыя факты з жыцця беларускага юрыста, гісторыка, публіцыста, культурнага і палітычнага дзеяча Міколы Шкялёнка, тым больш што такія факты і звесткі ёсць.

Стар. 6

**ПАСЛЯ ДАЛАЙ ЛАМЫ**

У Дхарамсале, што на поўначы Індыі, закончыліся зборы тыбецкай эміграцыі, удзельнікі якіх абмеркавалі перспектывы руху за незалежнасць краю.

Стар. 11

**СІМВАЛЫ ПРЫМІРЭННЯ**

Беларусь у вайне 1812 года.

Стар. 14–15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**«ГАЛЕРЭЯ «ПАДЗЕМКА» — ЭКСПЕРЭМЕНТАЛЬНАЯ ПЛЯЦОЎКА СУЧАСНАГА МАСТАЦТВА»**

Размова з дырэктарам Валянцінай Кісялёвай

▸ **ГЕАПАЛІТЫКА**

# КАНФЛІКТ ІНТАРЭСАЎ

**Вольга ХВОІН**

**Масква і Мінск не паразумеліся на вышэйшым дзяржаўным узроўні. Запланаванае пасяджэнне вышэйшай дзяржаўнай рады саюзнай дзяржавы Расіі і Беларусі было нечакана сарванае. Падставай для канфлікту стала разыходжанне ў поглядах адносна падпісання расійска-беларускай дамовы аб аб'яднанай сістэме супрацьпаветранай абароны краінаў.**




**Плакат. Справа №__, Дзмітры Сурскі, Таццяна Гардашнікава, 1989. Павуцінне з канцылярскіх сьчэпак як сімвал працы бюракратыі.**

Пасяджэнне Вышэйшай дзяржрады пераносіцца ўжо ў другі раз. Першапачаткова яно мусіла адбыцца 3 лістапада. Але 25 кастрычніка прайшла сустрэча кіраўнікоў Расіі і Беларусі Дзмітрыя Мядзведзева і Аляксандра Лукашэнкі, пасля якой пасяджэнне перанеслі на пачатак снежня. Меркавалася, што сустрэча кіраўніцтва Вышэйшай дзяржрады стане «пераломнай у гісторыі Саюзнай дзяржавы». Аляксандр Лукашэнка восенню заяўляў, што «саюзныя адносіны да канца года павінны быць паднятыя на новую вышыню. Нам варта выпрацаваць некалькі, а можа, і адну праграму, якая дазволіла б выйсці на больш істотныя адносіны». Хадзілі чуткі, што на пасяджэнні, якое так і не адбылося, планавалася разгледзець пытанні прыняцця Канстытуцыйнага акту Саюзнай дзяржавы і пераходу дзвюх краін на адзіны сродак аплаты.

Разам з тым у нядаўнім інтэрв'ю агенцтву France Presse Аляксандр Лукашэнка заявіў, што Саюзная дзяржава не развіваецца з-за адсутнасці Канстытуцыйнага акту. Праекты гэтага дакумента беларускага лідэра не задавальняюць, бо яны «значна слабей дзеючай цяпер дамовы аб стварэнні Саюзнай дзяржавы». Дарэчы, у першым варыянце канстытуцыйнага акту гаворыцца, што пасаду прэзідэнта саюза займае прэзідэнт РФ. Кіраўніку Беларусі адводзіцца роля віцэ-прэзідэнта. Другі праект прадугледжвае абранне адзінага прэзідэнта грамадзянамі Расіі і Беларусі праз усеагульнае прамое галасаванне, а пасады віцэ-прэзідэнтаў займуць кіраўнікі Расіі і Беларусі. Паводле трэцяга варыянту акту, органам улады з'яўляецца вышэйшая дзяржрада, якая складаецца з прэзідэнтаў абедзвюх краінаў, урадаў і парламентаў. Кіраваць гэтай структурай мусіць старшыня вышэйшай дзяржрады, які абіраецца народам. Відавочна, што кіраўнік Беларусі не гатовы выпускаць з рук лейцы ўлады, а Расія ўсё больш настойліва імкнецца перайсці ад шматгадовых папулісцкіх размоў да справы.

На фоне дыялогу з Захадам афіцыйны Мінск старанна імкнецца ўнікнуць праяў падтрымкі афіцыйнага курсу Масквы. Пытанне прызнання незалежнасці Абхазіі і Паўднёвай Асеціі Аляксандр Лукашэнка аддаў на водкуп новаабранаму парламенту, падкрэсліўшы, што ціск Масквы тут непрымальны. Пад абяцанні вырашыць гэта пытанне Беларусь здолела дамовіцца на атрыманне ад Расіі крэдыту на два мільярды долараў, палова гэтых грошай ужо пералічаная на беларускі рахунак. Грашовыя падмазванні колаў у возе з шыльдаю «Саюзная дзяржава» ніякім чынам на хуткасць гэтага самага возу не паўплывалі. Беларусь цяпер актыўна імкнецца наладзіць супрацу з Захадам. І, адчуваючы падтрымку ды зацікаўленасць Еўропы, Лукашэнка пачуваецца досыць упэўнена, каб не лезці самому ў расійскія путы. Падобныя манеўры наўрад ці прыйшліся Крамлю да спадобы. Не выключана, што бліжэйшым часам Расія можа распачаць супраць Беларусі кампанію эканамічных санкцый, каб «прастымуляваць» амбітнага беларускага лідэра да аб'яднання. Першыя ластаўкі эканамічных санкцый з Усходу былі яшчэ на пачатку мінулага месяца: Россельгаснагляд заявіў што «сістэма кантролю якасці прадукцыі жывёльнага паходжання ў Беларусі не можа гарантаваць бяспеку прадуктаў, якія пастаўляюцца ў Расію». Гэта азначае, што пастаўкі айчыннай сельскагаспадарчай прадукцыі ў Расію (гэта краіна з'яўляецца асноўным імпарцёрам беларускага мяса і малака) у любы момант могуць быць прыпыненыя, што балюча адаб'ецца на адпаведнай галіне айчыннай гаспадаркі. Акрамя таго, на днях прэм'ер-міністр Расійскай Федэрацыі Уладзімір Пуцін падпісаў распараджэнне аб будаўніцтве другой галіны Балтыйскай трубаправоднай сістэмы (БТС–2) у абыход Беларусі праз Унечу (Бранская вобласць) і Усць-Лугу (Ленінградская вобласць). Будаўніцтва другой чаргі трубаправода павінна пачацца ў 2009 годзе, а завяршыцца ў 2011-м. Трубаправод плануецца пабудаваць да порта Усць-Лугу (Ленінградская вобласць) з адгалінаваннем на Кірышскі нафтаперапрацоўчы завод. Праект ацэньваецца ў 120–130 мільярдаў расійскіх рублёў. Увядзенне ў эксплуатацыю БТС–2 дазволіць Расіі павялічыць прапускную здольнасць порта Прыморск да 150 мільёнаў тон нафты ў год і цалкам адмовіцца ад транзіту нафты па тэрыторыі Беларусі і Польшчы ў Еўрасаюз. Такім чынам, Беларусь згубіць адзін з істотных рычагоў уздзеяння на Расію і падставы для эканамічнага ды палітычнага гандлю.

Цяпер, калі Расія ўсё больш рашуча патрабуе ад беларускага кіраўніка не толькі словаў, але і рэальных дзеянняў у галіне пабудовы Саюзнай дзяржавы, наладжванне адносінаў у заходнім накірунку вельмі дарэчы. Лукашэнка больш дзесяці гадоў атрымліваў грошы ад Расіі пад заклад уяўнай Саюзнай дзяржавы. Выглядае на тое, што цяпер ён не мае намер атрымаць фінансаванне з Еўропы на «развіццё дэмакратыі». А заадно і захаваць свой асабісты суверэнітэт ад пажаднай усходняй суседкі.

## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### БРЭСТ

**2 снежня валанцёры таварыства Чырвонага Крыжа праводзяць у Брэсцкім дзяржаўным універсітэце імя А. Пушкіна акцыю, прымеркаваную да Сусветнага дня барацьбы з гандлем людзьмі.**

Мерапрыемства арганізавана імі пры падтрымцы абласнога інфармацыйна-кансультацыйнага цэнтра «Рукі дапамогі», што працуе на базе гарадской арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа (БТЧК).

Як расказала БелаПАН кіраўнік цэнтра, старшыня гарадской структуры БТЧК Ніна Саванеўская, акцыя праходзіць у рамках рэалізацыі праграмы БТЧК «Барацьба з гандлем людзьмі: Рэспубліка Беларусь», каб прыцягнуць увагу моладзі да таго, як не стаць ахвярай такіх злачынстваў.

У акцыі задзейнічана каля 20 валанцёраў. У калідорах ВНУ паміж лекцыямі яны праводзяць флэш-мобы, раздаюць тэматычныя інфармацыйныя матэрыялы. Імі створана «сцяна, што размаўляе», на адной з якой вывешаны плакаты са словамі: «Я не патраплю ў рабства, бо...» і «Гандаль людзьмі гэта...». Студэнтам трэба прадоўжыць выразы і выказаць сваё меркаванне па гэтай праблеме.

Як зазначыла Саванеўская, мерапрыемствы, прымеркаваныя да Сусветнага дня барацьбы з гандлем людзьмі, праходзяць і ў іншых навучальных установах вобласці. Сярод іх інтэрактыўныя трэнінгі, «круглыя сталы», прагляды тэматычных фільмаў з іх наступным абмеркаваннем, распаўсюджванне друкаванай прадукцыі, акцыі «Адмаўляйся ад спакусы».

У рамках Сусветнага дня барацьбы з гандлем людзьмі інфармацыйна-кансультацыйным цэнтрам «Рукі дапамогі» абвешчаны абласны конкурс на лепшую мультымедыйную прэзентацыю.

### СВЕТЛАГОРСК

**У Свята-Прэабражэнскім саборы Светлагорска адкрыты памятны знак ахвярам ВІЧ-інфекцыі.**

Гэта першы такога кшталту помнік ахвярам СНІДу ў Беларусі. Знак уяўляе гранітную стэлу, на якой напісана «Памятаць, жыць, быць побач», а таксама выяўлены крыж і стужачка, якая сімвалізуе салідарнасць з заражанымі ВІЧ.

Адкрыццю знака папярэднічаў малебен у Свята-Прэабражэнскім саборы ў памяць аб памерлых ад ВІЧ людзях.

На цырымоніі адкрыцця знака протаіерэй Аляксандр Кісель заклікаў праявіць міласэрнасць да ўсіх хворых, у тым ліку ВІЧ-інфікаваных. «Царква ніколі не дзяліла людзей на ВІЧ-інфікаваных і здаровых, — сказаў святар. — Мы гатовы прыняць любога чалавека, працягнуць яму руку дапамогі». Пры гэтым ён падкрэсліў, што паколькі асноўным шляхам перадачы ВІЧ-інфекцыі з'яўляецца палавы, у грамадстве неабходна павышаць аўтарытэт сям'і і выхоўваць культуру сямейных адносінаў.

Адкрыццё помніка ініцыявана грамадскім аб'яднаннем «Альтэрнатыва» і протаіерэем Аляксандрам Кісялём пры падтрымцы ПРААН, Міжканфесійнай місіі «Хрысціянскае сацыяльнае служэнне». Па задуме аўтараў ідэі, каля знака можна будзе ўшанаваць памяць людзей, памерлых ад СНІДу, а таксама памаліцца аб здароўі тых, хто жыве з ВІЧ.

Частковае фінансаванне стварэння помніка ажыццёўлена ў рамках праекта ПРААН «Садзеянне дзейнасці хрысціянскіх цэркваў Беларусі ў галіне ВІЧ і СНІДу». Праект разлічаны на студзень 2008 — ліпень 2009 года, агульная сума фінансавання — 70 тысяч долараў ЗША.

Памятны знак ахвярам СНІДу ўстаноўлены ў Светлагорску ў сувязі з вялікім распаўсюджваннем у горадзе захворванняў на ВІЧ-інфекцыю. Паводле інфармацыі санслужбы, агульная колькасць выяўленых ВІЧ-інфікаваных у Светлагорскім раёне складае 2595. Гэта больш за палову выпадкаў выяўлення інфекцыі ў Гомельскай вобласці.

Паводле звестак Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя, на 1 лістапада ў краіне зарэгістраваны 9 423 выпадкі ВІЧ-інфекцыі.

АКЦЫЯ

## НЕСАНКЦЫЯНАВАНАЯ ВАНДРОЎКА

**Больш як 60 дэмакратычных актывістаў 30 лістапада ажыццявілі несанкцыянаваную краязнаўчую паездку па Мінскай вобласці ў гонар 88-й гадавіны Слуцкага збройнага чыну 1920 года і змагароў за незалежнасць Беларусі, паведаміў БелаПАН старшыня секцыі «Мемарыял» Беларускага добраахвотнага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Вячаслаў Сіўчык.**

Паводле яго слоў, у паездцы, арганізаванай секцыяй «Мемарыял», удзельнічалі актывісты таварыства разам з яго старшынёй Антонам Астаповічам, прадстаўнікі моладзевых дэмакратычных аб'яднанняў, а таксама палітык Мікалай Статкевіч і даследчык гісторыі Слуцкага збройнага чыну Ніна Стужынская. Паездка ажыццяўлялася па традыцыйным маршруце: Мінск — вёска Грозаў — вёска — Семежава (абедзве ў Капыльскім раёне) — вёска Чырвоная Слабада (былая Вызна ў Салігорскім раёне) — Старыя Дарогі — Мінск з наведваннем мемарыяльных крыжоў на месцах баёў паўстанцаў з рэгулярнымі войскамі Чырвонай Арміі, а таксама Старадарожскага музея выяўленчага мастацтва (фонд Анатоля Белага).

Удзельнікі паездкі ўшанавалі памяць герояў паўстання ўскладаннем кветак да мемарыяльных крыжоў, хвілінай маўчання і выкананнем песень беларускага нацыянальнага адраджэння.

«Вынікам мерапрыемства стала рашэнне пашырыць маршрут традыцыйнай паездкі і ўстанавіць шэраг новых мемарыяльных крыжоў на месцах, звязаных са Слуцкім чынам», — сказаў Сіўчык.

Ён зазначыў, што прадстаўнікі сілавых структур не перашкаджалі ўдзельнікам паездкі.

17 лістапада арганізатары мерапрыемства звярнуліся ў Мінскі аблвыканкама з лістом, у якім інфармавалі аб намеры ажыццявіць 30 лістапада краязнаўчую паездку па месцах Слуцкага збройнага чыну. 27 лістапада старшыні таварыства аховы помнікаў А. Астаповічу патэлефанаваў чыноўнік аблвыканкама, які паведаміў аб адмове санкцыянаваць паездку ў сувязі з няправільным афармленнем заяўкі на правядзенне масавага мерапрыемства. Летась афіцыйная санкцыя на паездку была атрымана.

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

## ЛЯБЕДЗЬКУ ЗАТРЫМАЛІ

**2 снежня Анатоль Лябедзька і актывісты партыі накіроўваліся ў вёску Міхалішкі, каб агледзець пляцоўку, якую ўлады назвалі ў якасці прыярытэтнай для будаўніцтва атамнай станцыі. Машыну, якой кіраваў лідэр АГП, спыніў супрацоўнік ДАІ. Аўтамабіль з лідэрам і актывістамі АГП дзве міліцэйскія машыны суправадзілі ў Астравецкі РАУС.**



Photo.ByMedia.Net

«Пасля гэтага нас даставілі ў камендатуру пагранвойскаў нібыта за тое, што мы праехалі па памежнай зоне. Мы спрабавалі пераканаць памежнікаў, што ехалі транзітам і маем права знаходзіцца без дазволу ў гэтай зоне да трох гадзін, але ў адносінах да нас усё роўна пачалі складаць адміністрацыйныя пратаколы. Аднак сітуацыя ў чарговы раз змянілася: са з'яўленнем начальніка камендатуры ў нас узялі толькі тлумачэнні, што мы сапраўды былі ў гэтай зоне транзітам, і адпусцілі», — сказаў Лябедзька.

Як паведаміў палітык, з яго аўтамабіля забралі друкаваную прадукцыю — 1 211 улётак аб запланаваных акцыях пратэсту прадпрымальнікаў, 317 улётак Аб'яднаных дэмакратычных сіл аб свабодзе сумлення, 25 дыскаў з выступленнем Анатоля Лябедзькі на тэлеканале «Белсат», каля дзесятка каляндарыкаў і некалькі налепак з яго выявай. «Гэтыя матэрыялы будуць правярацца на наяўнасць у іх экстрэмізму і пагрозы дзяржаўнаму ладу», — сказаў палітык.

«Між іншым, мы выканалі ўсю праграму паездкі, на якую разлічвалі. Адзінае, што нам не ўдалося зрабіць, дык гэта даехаць да плануемай пляцоўкі будаўніцтва беларускай АЭС. А так мы сустрэліся з выбаршчыкамі і прадпрымальнікамі на рынках Ашмянаў і Астраўца, азнаёміліся з меркаваннем насельніцтва наконт будаўніцтва АЭС у іх рэгіёне, правялі шэраг добрых сустрэч», — зазначыў Лябедзька.

ТЭНДЭНЦЫЯ

## ЗА ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА — У ПАДАТКОВУЮ ІНСПЕКЦЫЮ

Язэп ПАЛУБЯТКА

**Грамадскі актывіст з Лельчыцаў Мікалай Гаўрыленка нечакана для сябе заказным лістом быў выкліканы ў мясцовую інспекцыю Міністэрства па падатках і зборах Рэспублікі Беларусь.**

Там старшы дзяржаўны інспектар Аляксандр Юцэнка паведаміў, што паступілі звесткі ад Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь, нібыта Гаўрыленка навучаўся на семінарах па імплементацыі міжнародных абавязкаў Рэспублікі Беларусь у галіне правоў і свабодаў чалавека ў Вільнюсе ў 2007 годзе, які ладзіла Міжнародная сетка Дамоў правоў чалавека. Падатковы інспектар запатрабаваў даць тлумачэнні, за якія сродкі ехаў Гаўрыленка да месца правядзення семінару, навучаўся, пражываў, харчаваўся, і якую суму атрымаў па заканчэнні.

Падобныя стасункі Мікалая Гаўрыленка з падатковай інспекцыяй адбываюцца не ўпершыню.

Як толькі сёлета ён зарэгістраваўшыся кандыдатам у дэпутаты у Палату прадстаўнікоў па Палескай выбарчай акрузе ад апазіцыі, то падатковая інспекцыя тэрмінова запатрабавала прадставіць дэкларацыю аб даходах. Падобныя патрабаванні атрымалі не толькі сямейнікі, але 83-гадовая маці і 69-гадовая цешча.

ПІКЕТ

## ПАДТРЫМКА НЕЗАЛЕЖНЫХ ГАЗЕТ

**Намеснік старшыні моладзевай арганізацыі Партыі БНФ «Моладзь БНФ» Антон Каліноўскі падаў 1 снежня ў Мінгарвыканкам заяўку на правядзенне пікета ў падтрымку незалежных газет.**

Як паведаміў БелаПАН А. Каліноўскі, пікет павінен адбыцца 23 снежня на плошчы Якуба Коласа ў Мінску.

«Хаця ўлада і пусціла да чытачоў «Нашу ніву» і «Народную волю», гэта не азначае, што сітуацыя змянілася ў цэлым, — лічыць А. Каліноўскі. — У краіне існуюць дзесяткі газет — «Новы час», «Наша слова», «Віцебскі кур'ер» і іншыя, — якія не могуць выдавацца і распаўсюджвацца. Журналісты незалежных радыёстанцый не могуць атрымаць акрэдытацыю для выканання сваёй працы, а моладзь, якая займаецца выданнем лакальных незарэгістраваных газетак, рызыкуе трапіць на суткі ці заплаціць вялізны штраф».

«Пікетам мы хочам прыцягнуць увагу беларускай грамадскасці і міжнароднай супольнасці да гэтай праблемы. Зараз «Моладзь БНФ» пачне выдаваць матэрыялы па гэтай праблематыцы. Мы плануем кампанію «За вызваленне незалежнай прэсы». У выніку забароны правядзення пікету ўлада пакажа Беларусі і свету сваё стаўленне да праблемы СМІ, сваё сапраўднае стаўленне да сітуацыі са свабодай прэсы ў нашай краіне. Мы не хацелі б, каб улада паказала сябе праз чарговую адпіску ці забарону», — сказаў Каліноўскі.

ПАЛІВА

# ТАРЫФ РАСЦЕ, БЕНЗІН ТАННЕЕ

Вольга ХВОІН

**Беларусь павысіла тарыф на транзіт нафтапрадуктаў па магістральных трубаправодах з 0,89 да 1,36 долара за тону на 100 кіламетраў. Новы тарыф пачне дзейнічаць з 1 студзеня 2009 года. Апошні раз тарыфы на транзіт нафты павышаліся тры гады таму ў студзені 2005 года.**

У пераглядзе тарыфаў эксперты бачаць сувязь з канфліктам Расіі і Мінска і зрывам паседжання Вышэйшай дзяржаўнай рады Саюзнай дзяржавы, якое мусіла адбыцца 1 снежня. Распараджэнне Мінэканомікі амаль супала па часе з рашэннем Расіі аб пабудове нафтатранспартнай сістэмы БТС–2 у абыход Беларусі. Эканаміст Леанід Злотнікаў лічыць, што асноўнай падставай для падпісання рашэння аб будаўніцтве другой ніткі Балтыйскай трубаправоднай сістэмы сталася тое, што «Расіі надакучыла высвятляць адносіны з Беларуссю і Польшчай па пытаннях транзіту». Трубаправод быў запраектаваны пасля скандалаў у 2007 годзе, цяпер, калі адносіны зноў абвастрыліся, кіраўніцтва Расіі вырашыла, што будзе значна прасцей выдаткаваць некалькі мільярдаў долараў на будаўніцтва ўласнай нафтатранспартнай сістэмы, чым вырашаць канфлікты, — лічыць эканаміст. — Трубаправод «Дружба» ляжыць у зямлі каля трыццаці год, набліжаецца час яго рэканструкцыі. Беларусі наўрад ці гэта будзе пад сілу, а Расіі выгодней пабудаваць новы, чым наладжваць беларускі — тут супалі эканамічныя і палітычныя інтарэсы. З эканамічнага пункту гледжання Беларусі гэта пагражае стратай аб'ёмаў транзіту прыкладна напалову і, адпаведна, даходаў. Цяпер штогод мы перапампоўваем каля 90 мільёнаў тон нафты, калі браць дзеючыя расцэнкі, то можам згубіць прыкладна 250 мільёнаў прыбытку. Але варта ўлічваць, што ў доўгатэрміновай перспектыве аб'ёмы паставак нафты Расіяй за мяжу будуць скарачацца, і цалкам можа стацца, што Расія ўвогуле адмовіцца ад паслуг Беларусі як транзіцёра. Што тычыцца падвышэння тарыфу на транзіт, то гэта хутчэй вяртанне да рэальнай стаўкі тарыфу. За тры гады, пакуль Беларусь не змяняла тарыф, долар істотна дэвальваваўся, і аплата за транзіт фактычна не адпавядала рэчаіснасці».



Photo.ByMedia.Net

Таксама стала вядома, што з 1 снежня стаўка экспартнага мыта на нафту ў Беларусі паніжана з 287,3 да 192,1 долара за тону. У адпаведнасці з міжурадавай беларуска-расійскай дамовай, стаўкі экспартных мытаў на нафту і нафтапрадукты ў Беларусі ўстанаўліваюцца ў памеры, роўным стаўкам, якія дзейнічаюць у Расіі. Уводзіцца ў дзеянне яны павінны ў тыя жа тэрміны, што і стаўкі, якія ўстанаўліваюцца адпаведнымі нарматыўнымі прававымі актамі Расійскай Федэрацыі. Цяпер стаўка экспартнай мыты для светлых нафтапрадуктаў складзе 141,8 долара за тону (было 205,9 долара за тону), цёмных — 76,4 долара за тону (было 110,9 долара за тону). Паводле беларуска-расійскім дамоўленасцяў, мытныя зборы, па якіх пастаўляецца ў Беларусь з Расіі нафта ў 2008 годзе, разлічваюцца з ужываннем каэфіцыента 0,335. З 1 снежня мыта складзе для Беларусі 64,4 долара. Акрамя таго, улады Расіі 1 снежня 2008 года перайшлі да штомесячнага ўсталявання мыт на вываз нафты і нафтапрадуктаў (раней — раз на два месяца).

Напрыканцы лістапада намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Андрэй Кабякоў заявіў журналістам, што ўрад Беларусі ініцыюе адмену экспартнага мыта на расійскую нафту, якая пастаўляецца на беларускія нафтаперапрацоўчыя прадпрыемствы. Гэта абумоўлена дамоўленасцямі паміж двума бакамі аб стварэнні да канца 2010 года паўнавартаснага Мытнага саюза Беларусі і Расіі.

Для беларускіх аўтааматараў пачатак зімы адзначаны добрай весткай: з 1 снежня рознічныя кошты на бензін і дызельнае паліва паніжаныя на 10. Як паведаміла інфармагенцтва БелаПАН, кошт бензіну, калі разлічвацца пры запраўцы гэтым палівам замежнай валютай, паніжаны на 20 працэнтаў. Такім чынам, кошт бензіну А–76 (Н–80) складае з 1 снежня 1760 рублёў за літр (мінус 190 рублёў), бензіну АИ–92 — 2220 рублёў (мінус 250 рублёў), бензіну АИ–95 — 2530 рублёў (280 рублёў), дызпаліва — 2020 рублёў (220 рублёў). Сёлета кошты на паліва ў Беларусі падвышаліся тройчы — 10 чэрвеня, 18 і 23 ліпеня. Гэта тлумачылася ростам коштаў на нафту. З пачатку восені кошты на нафту на сусветных рынках імкліва зніжаліся. Нафта за гэты час патаннела амаль утрая, і цяпер яе кошт складае прыкладна 47 долараў за барэль.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# САЮЗНАЯ ДЗЯРЖАВА СУПРАЦЬ СНІДУ

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Запланаванае пасяджэнне Вышэйшай дзяржаўнай рады (ВДР) Саюзнай дзяржавы ў Маскве не адбылося. Гэтая падзея, што не адбылася, стала яшчэ адным каменем — але не ў будаўніцтве Саюзнай дзяржавы, а хутчэй у пахавальнай пірамідзе добрых намераў па стварэнні апошняй.**

Як зазвычай у Расіі, здарылася ўсё так, як у прымаўцы: «Іван паказвае на Пятра». Расійская газета «*Коммерсантъ*» са спасылкай на Івана Макушка, прэс-сакратара дзяржаўнага сакратара Саюзнай дзяржавы Паўла Барадзіна, паведаміла, што «расійскі бок быў гатовы правесці дзяржраду 1 снежня». «Пра сваю гатоўнасць заяўлялі і беларусы. Але потым адзін з бакоў прапанаваў для разгляду шэраг істотных пытанняў, якія патрабуюць дадатковага ўзгаднення і пераносу даты дзяржрады», — паведаміў «*Коммерсанту*» прэс-сакратар Барадзіна.

Як заявіў А. Лукашэнка 30 кастрычніка на нарадзе па пытаннях знешняй і ўнутранай палітыкі, «пасяджэнне Вышэйшай дзяржрады Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі будзе асаблівым». «Я, як старшыня ВДС, зраблю ўсё, каб мы ўнеслі ў парадак дня істотныя пытанні, змястоўныя, якія тычацца самага галоўнага ў нашых адносінах з Расіяй. У адваротным выпадку мы Вышэйшую дзяржраду і праводзіць не будзем», — сказаў беларускі прэзідэнт. Ён падкрэсліў, што «ўсе дробныя пытанні» можна разглядаць у рабочым парадку. «А прынцыпова трэба разглядаць тыя пытанні, якія па сутнасці ўплываюць на ўзаемаадносіны паміж нашымі дзяржавамі. Такіх пытанняў шмат», — заявіў Лукашэнка.

Але расійскія палітолагі кажуць, што Расію насамрэч не задаволіў парадак дня пасяджэння Вышэйшай дзяржрады Саюзнай дзяржавы. Прынамсі, такое меркаванне выказаў Андрэй Суздальцаў. Паводле яго слоў, «галоўнае пытанне, якое хацеў вырашыць беларускі бок, — атрымаць другі транш расійскага крэдыту». «Беларусі неабходна вырашыць гэта пытанне менавіта сёлета, бо ў 2009 годзе ёй давядзецца прасіць яшчэ адзін крэдыт», — лічыць палітолаг.

На думку Суздальцава, кіраўніцтва Беларусі ставіла перад сабой і «задачу максімум — пагаварыць пра безумоўную дапамогу з боку Расіі ва ўмовах міжнароднага фінансавага крызісу». Ён лічыць, што ў хуткім часе рэспубліка сутыкнецца з «масай праблем», звязаных з гэтай з'явай.

Пры гэтым Суздальцаў лічыць, што «Маскву не задаволіла аргументацыя», з дапамогай якой Беларусь спрабавала настойваць на сваім парадку дня пасяджэння ВДР. «Калі Беларусь хоча разлічваць на дапамогу Расіі, то ёй трэба гаварыць аб Канстытуцыйным акце, увядзенні адзінай валюты», — сказаў ён.

Такім чынам, калі Масква адмяніла пасяджэнне, то ёсць варыянт, што Аляксандра Рыгоравіча проста паставілі на месца. Расія паказала яму: хоць ты і старшыня ВДР, аднак для нас ты ніхто. Сапраўды, калі старшыня Саюзнай дзяржавы не можа сабраць пасяджэнне, гэта шмат кажа пра тое, што такое Саюзная дзяржава, што такое ВДР і кім з'яўляецца старшыня.

Эксперты шмат разважалі па гэтым пытанні: хто вінаваты і каму гэта выгадна. Мне ж падаецца, што ўсе яны памыляліся. Справа ў тым, што 1 снежня — гэта сусветны дзень барацьбы са СНІДам. І ў такі дзень разглядаць пытанні па аб'яднанні Беларусі і Расіі (праекты Канстытуцыйнага акту, пераход на разлік паміж дзяржавамі ў расійскіх рублях, адзіную валюту і г. д.) прэзідэнтам неяк няёмка. На фоне сусветнага эканамічнага крызісу такія пытанні ў дзень барацьбы са СНІДам (акт, грошы за акт і г. д.) не разглядаюцца.

Дрэнная навіна для аўтааматараў і ўсіх іншых, хто не ставіцца з павагай да нашых міліцыянераў, супрацоўнікаў ДАІ і іншых прадстаўнікоў сілавых структураў. Зараз паказаць фігу або нейкі іншы знак супрацоўнікам, напрыклад, ДАІ, стане складаней. У Акадэміі МУС Беларусі пачалі вывучаць мову жэстаў. Эксперыментальная група з 30 курсантаў чацвёртага курса будзе навучацца на працягу васьмі месяцаў — з лістапада па чэрвень. Заняткі праводзяць работнікі грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства глухіх» і выкладчыкі факультэта спецыяльнай адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка.

Новы прадмет вывучаюць па 10 курсантаў крымінальна-выканаўчага факультэта, факультэта міліцыі і следча-эксперыментальнага факультэта акадэміі. На тэрыторыі СНД аналагаў такой адукацыйнай праграме няма ні адным з ВНУ сістэмы МУС. У працэсе навучання курсанты авалодаюць неабходным аб'ёмам тэарэтычных і практычных ведаў у галіне мовы жэстаў, азнаёмяцца з яго лінгвістычнымі адметнасцямі і структурай, дасягнуць дастатковага ўзроўню камунікатыўнай кампетэнцыі ў зносінах з глухімі людзьмі, сфармуюць псіхалагічную гатоўнасць да зносін з імі.

Мажліва, курсанты вывучаюць мову жэстаў не толькі глухіх, але і універсальныя жэсты, якія ў розных краінах могуць азначаць цалкам рознае. І таму, нават калі жэст у адносінах да супрацоўнікаў міліцыі вам падаецца абсалютна бяскрыўдным — не спяшайцеся спадзявацца на тое, што ён не будзе інтэрпрэтаваны з кітайскага альбо малазійскага пункту гледжання! І ўвогуле, абаронцаў правапарадку трэба паважаць.

Затое добрую навіну тыдзень прынёс з памежных войскаў. З 12 снежня адмяняецца прастаўленне ў пашпартах грамадзян Беларусі дата-штампаў пры перасячэнні беларускай мяжы. Справа ў тым, што 12 снежня набывае моц указ прэзідэнта ад 3 чэрвеня 2008 года № 294 «Аб дакументаванні насельніцтва Рэспублікі Беларусь».

У адпаведнасці з палажэннем аб дакументах, што сведчаць асобу, зацверджаным указам, унясенне службовымі асобамі беларускіх органаў пагранічнай службы, якія ажыццяўляюць пагранічны кантроль, адзнакі аб перасячэнні дзяржаўнай мяжы Беларусі — дата-штампа (адбітка нумаратара-датаўшчыка) — у пашпарт грамадзяніна Рэспублікі Беларусь не прадугледжана.

Гэта значыць, менш заплямленых непатрэбнымі адзнакамі старонак, і, адпаведна, больш месца для візаў.

▸ З НАГОДЫ

# УМЕЦЬ ЗНАЙСЦІ СВЯТЛО Ў ЦЕМРЫ

**«Мне вельмі пашанцавала ў жыцці», — з гэтай фразы пачалася нашая размова з выбітным беларусам — навукоўцам і грамадскім дзеячам Радзімам Гаўрылавічам Гарэцкім. Няпросты лёс, багатая гісторыя сям'і і аграмадная любоў да жыцця. 8 снежня Радзім Гаўрылавіч — сын акадэміка Гаўрылы Гарэцкага і пляменнік літаратара Максіма Гарэцкага — адзначае сваё 80-годдзе. Радзім Гаўрылавіч — акадэмік беларускай і расійскай Акадэмій навук, двойчы запар абіраўся кіраўніком грамадскай арганізацыі «Згуртаванне беларусаў свету «Бацькаўшчына». Надзвычай пазітыўны і годны чалавек. Размову з ім вядзе журналіст «НЧ» Вольга Хвоін.**



— Першы раз мне пашанцавала, калі нарадзіўся ў добрых бацькоў. Лепшых за іх людзей я не ведаю. Самае галоўнае — яны надалі мне аптымізму на ўсё жыццё. У мяне такі ўзрост, што невядома, ці віншаваць мяне, ці спачуваць мне. Восем нуль — гэта о-ё-ёй! Я разумею, што трэба рыхтавацца да развітання з гэтых светам, але мне зусім гэтага не хочацца. Хочацца яшчэ пажыць. Другі раз мне пашанцавала з добрымі настаўнікамі. З маім навуковым настаўнікам — акадэмікам Аляксандрам Яншыным я сустрэўся, калі быў дыпломнікам Маскоўскага нафтавага інстытуту. Ён запрасіў мяне ў геалагічны інстытут Акадэміі навук у Маскве. Там працавалі выдатныя навукоўцы, у якіх было чаму вучыцца. Гэта адзін з трох асноўных этапаў майго жыцця. У Маскве я адпрацаваў дваццаць гадоў, а ў Мінск вярнуўся амаль праз сорак. Атрымліваецца, што я беларус па генах, а па выхаванню хутчэй быў рускі. Нарадзіўся я ў Менску — у метрыках так і напісана, мне вельмі да спадобы такая назва. Вось бацька быў сапраўдным беларусам, светлым апантаным чалавекам. Яго не хацелі бачыць у Беларусі, бо быў «ворагам народа». Але ён кожны дзень думаў, гаварыў і пісаў пра сваю Радзіму, марыў вярнуцца. Жаданне гэта спраўдзілася толькі ў 69 год. Ён прыехаў з маёй маці сюды, спачатку жыў у інтэрнаце, хаця быў акадэмікам, доктарам навук.

***— А чаму Вы вырашылі пакінуць Маскву? Кар'ера складвалася ўдала, чаго яшчэ было хацець?***

— У 1971 годзе, праз два гады пасля вяртання ў Беларусь бацькі, сюды прыехаў і я. На той час я быў сталым навукоўцам — доктарам навук, лаўрэатам дзяржаўнай прэміі СССР. Наш інстытут геалагічных навук пры Акадэміі навук Беларусі толькі-толькі арганізаваўся, і пачалася мая праца ў Беларусі. Хрушчоў тады ўсё рэфармаваў. І прыдумаў, што геалогія — гэта не навука. Інстытут перадалі міністэрству прыроды. Але Акадэмія навук не можа існаваць без такой навукі, як геалогія. Захаваліся невялікая лабараторыя, геафізічная абсерваторыя. На іх базе і паўстаў Інстытут геахіміі і геафізікі АН БССР. Атрымалася так, што мяне спачатку абралі членам Акадэміі навук БССР па спецыяльнасці «геалогія», а затым прызначылі дырэктарам Інстытута геахіміі і геафізікі АН БССР. Мы стваралі інстытут, быў узведзены будынак, што, між іншым, было досыць цяжка, як, думаю, і цяпер. Калі толькі інстытут стварыўся, у ім працавала 90 чалавек, ужо пад маім кіраўніцтвам штат супрацоўнікаў павялічыўся. Да перабудовы інстытут быў у росквіце: ладзілася міжнародная праца, навукоўцы атрымлівалі прэміі. Усё было выдатна. Пасля пачалася перабудова, і справы пагоршыліся. А ў 1994 годзе нашаму чыноўніцтву засвярбела думка пра рэфармаванне, і да таго дарэфармаваліся, што інстытут наш сёлета закрылі. Навуку аб зямлі разгрмілі, нашы фундаментальныя распрацоўкі цяпер нікому не цікавыя. Ад геолагаў заўсёды патрабуюць прыкладной працы: «Нафту адкрылі? Золата знайшоў?» — «Не». Тады і карысці ад цябе няма. Але на самай справе геалогія — гэта не толькі навука аб карысных выкапнях. Гэта — гісторыя зямлі. Нашай зямельцы тры з паловай мільярды гадоў. Хто ж гэта вывучаць будзе? Калі нашай справай ніхто займацца не будзе, то атрымаецца белая пляма на карце Зямлі, бо каб усё зразумець, трэба мець цэласную карціну. У савецкія часы Міністэрства геалогіі па затратах было другое ці трэцяе пасля ваеннага. Гэта галіна патрабуе вялікіх выдаткаў, але яна сябе акупляе на гады наперад — палічыце, колькі Беларусь атрымлівае ад здабычы нафты, калійных угнаенняў, матэрыялаў для будоўлі. Няпраўда, што мы дармаеды.

***— А як цяпер справы з фінансаваннем навукі?***

— Кепска. Цяпер усё кепска фінансуецца. Маладыя спецыялісты імкнуцца пайсці на вытворчасць, бо там заробкі лепшыя. А ў Акадэміі малады навуковец атрымлівае 400–500 тысяч рублёў. Вельмі цяжка цяпер з кадрамі. Між іншым я выкладаў на геафаку БДУ. Павал Севярынец — мой вучань, вельмі здольны хлопец. Шкада, што не пайшоў у навуку — быў бы добрым геолагам.

***— Радзім Гаўрылавіч, Вы маеце многа дзяржаўных узнагарод. Ваш талент і праца прызнаныя і ў Беларусі, і за яе межамі. Але якая ўзнагарода бліжэйшая сэрцу?***

— У розным узросце ўзнагароды ўспрымаеш па-рознаму. Спачатку мяне вельмі ўзрадавала прэмія ад Маскоўскага таварыства выпрабавальнікаў прыроды за першую сваю манаграфію. Пасля было вельмі прыемна, калі атрымаў Дзяржаўную прэмію СССР за стварэнне Тэктанічнай карты Еўразіі пад кіраўніцтвам майго настаўніка акадэміка Яншына. Нас многа працавала над ёй, і адзнака працы была важнаю. Таксама было прыемна атрымаць ад Расійскай акадэміі навук прэмію імя акадэміка Мікалая Шацкага. Яшчэ адна значная і можа больш сардэчная для мяне прэмія імя Барыса Кіта, якую заснавала нямецка-беларускае таварыства. А пасля прызвычаіўся. Падумаеш, адной прэміяй больш, адной менш! Аднойчы я нават адмовіўся ад прэміі на карысць свайго калегі з Украіны. Яму прэмія была больш патрэбная. А ў мяне ўжо былі. ***(Смяецца)***

***— Ці не замінала кар'еры крэўная сувязь з «ворагам народу»?***

— Я адчуў гэта, калі быў яшчэ зусім малы. Бацькі дзяцей, з якімі я сябраваў, не хацелі, каб яны са мной гулялі. Памятаю, класе ў трэцім мне падабалася адна дзяўчынка сімпатычная, і я ёй, здаецца, падабаўся, але яе маці вельмі не любіла, калі мы разам гулялі. Тады я задумаўся, што нешта не так. У інстытут я паступіў без праблем. А калі прыйшоў на працу, то не адразу прынялі. Шацкі і Яншын мяне бралі, а начальнік аддзела кадраў пільна сачыў, каб ненадзейныя не патрапілі. Яшчэ два хлопцы разам са мной уладкоўваліся на працу. Больш месяца нас пратрымалі: у мяне — бацька «вораг народа», другі хлопец — напалову габрэй, таксама падазроны, а трэцяга ў вайну пад Смаленскам расстрэльвалі, але не расстралялі — значыць, нешта не тое... Пасля я прынёс ім бацькаў ордэн Чырвонага сцяга за Цымлянскую ГЭС. Пытанне адразу вырашылася. Бацьку яго біяграфія моцна перашкаджала. Ён удзельнічаў у многіх «будоўлях камунізму», але яго ніколі не ўзнагароджвалі, выкрэслівалі са спісаў. А намеснікаў яго — пакідалі. Ордэн Чырвонага сцяга быў першай дзяржаўнай узнагародай бацькі.

***— Як да Вас ставіліся калегі ў Маскве? Не было крыўды, што беларус дарогу пераходзіць мясцовым навукоўцам?***

— Калі я працаваў у Маскве, то і нацыяналістам не быў. Ніхто асабліва не цікавіўся сваім паходжаннем — гома савецікус дый годзе. Я не парваў адносінаў з акадэмічным асяродкам Расіі, і нават цяпер мяне часам узгадваюць як рускага навукоўца, які зрабіў унёсак у геалогію, мяне абралі замежным сябрам Расійскай акадэміі навук. Але расіяне па сваёй сутнасці імперцы. Мой добры сябра, акадэмік, аднойчы запытаўся, ці за аб'яднанне я. А калі даведаўся, што не вельмі ўхваляю саюз Расіі і Беларусі, то моцна не спадабалася яму гэта. Іншы мой сябра-акадэмік, вельмі інтэлектуальны чалавек між іншым, неяк быў у Беларусі і сказаў, што беларуская мова — гэта сапсаваная руская. А я яму кажу, што калі паглядзець з гістарычнага погляду, то атрымліваецца, што руская мова — гэта сапсаваная беларуская. Увогуле, расіяне добра ставяцца да беларусаў, але імперскія памкненні ўнутры ў іх, як ні круці, ёсць.

***— За час працы ў «Бацькаўшчыне», напэўна, склалася сваё меркаванне наконт беларусаў замежжа.***

— Беларусы ранейшай хвалі міграцыі ў большасці маюць сваю нацыянальную ідэнтычнасць. Мой дзядзька Максім Гарэцкі спецыяльна ездзіў у Сібір за сваімі абразкамі. Цікава, што сяляне там захавалі беларускасць яшчэ з часоў перасялення. Беларусы вельмі працавіты народ, і многія жывуць нават лепш за тубыльцаў, маюць моцныя гаспадаркі. Цяпер кожны трэці беларус жыве па-за межамі Беларусі. Калі б мы не з'язджалі, калі б не было вайны, то нас было б цяпер пэўна не дзевяць, а трыццаць мільёнаў. У амерыканскай эміграцыя жывуць цудоўныя людзі. Іх прынята бэсціць, але рэальных падстаў для гэтага я не бачу. Я сустракаўся з імі і хачу сказаць, што няблага было, каб мы тут былі такія ж, як яны там. Дарэчы, у іх вельмі адметная мова, яны захавалі ў гаворцы многа такіх слоў, якімі мы ўжо не карыстаемся. Я вучыўся беларускай мове ад сваіх маці і бацькі, і калі прыехаў у Беларусь, то мне таксама гаварылі, што ў мяне ёсць незвычайныя словы. Цяпер беларусы, якія з'язджаюць, сталі куды больш прагматычнымі. Яны ўмомант ператвараюцца ў амерыканцаў, рускіх, англічан... Ідуць працэсы глабалізацыі, ад гэтага нікуды не дзенешся. Але змагацца за беларускасць, беларушчыну — трэба. Мне ў гэтым сэнсе падабаецца Амерыка. Ліха ведае колькі там нацыянальнасцяў. Кожны з іх уважае сябе за амерыканца, але памятае і пра тое, хто ён па свайму крэўнаму паходжанню.

***— Адзін мой знаёмы замежнік неяк заўважыў, што ў беларусаў своеасаблівая ментальнасць. Вы можаце сказаць, чым мы вылучаемся сярод грамадзян свету?***

— Дабрыня — гэта безумоўная нашая рыса. Цяпер крышку «азвярэлі», але ў цэлым вельмі душэўны народ. Прыедзеш у вёску, цябе на лепшае месца пасадзяць і шкварачку падсмажаць. А яшчэ мы народ з добрым пачуццём гумару. Нехта думае, што свет выратуе прыгажосць, нехта думае — навука. А я лічу, што беларусаў ратуе гумар. А з адмоўных нашых рысаў — талерантнасць, якая пераходзіць у абыякавасць. Гэта нашая бяда. Ну, і начальства вельмі любім. А яшчэ беларусы такія крыўдлівыя — жудасць проста! І я часам пакрыўджуся на нешта, а сам пасля думаю: «Якое глупства крыўдавацца з-за такой драбязы!».

***— За сваё жыццё Вы, пэўна, выпрацавалі для сябе мудрасць і філасофію быцця. Ці не падзеліцеся з нашымі чытачамі?***

— Я лічу самай кепскай якасцю людзей — зайздрасць. Яна раз'ядае чалавека бы іржа. Хаця ў маладых зайздрасць заўсёды крыху ёсць, бо многа планаў, спадзеваў, жаданняў. Я радуюся, калі ў чалавека нешта добрае, не важна, супернік ці сябар. Другое маё правіла — не здавацца, але быць. Які ёсць, такі ёсць. Гэта дапамагае мне быць спакойным. Трэцяе — аптымізм, якому навучылі бацькі. Дзе б я ні быў, я знайду не горшае, а лепшае ў сітуацыі. Мы жылі ў лагерах, вайну прайшлі... Гэта мяне загартавала. Бываюць абставіны, што нічога не зробіш, але ты знайдзі нешта светлае, і гэта выратуе. І яшчэ я ніколі не раблю злога. Бацьку два разы прыгаварылі да смерці, але ён ніколі кепскага не сказаў ні пра савецкую ўладу, ні пра тых людзей, якія яму здрадзілі, ні пра тых, хто яго катаваў.

Напрыканцы размовы Радзім Гаўрылавіч узяў з пісьмовага стала два лісты з адрыўнога календара: на лісце за сёмага снежня было пазначана: «У гэты дзень Пастановай СНК БССР Гаўрыла Гарэцкі быў выключаны са складу сябраў Беларускай акадэміі навук», на лісце за восьмага снежня — «У гэты дзень спаўняецца 80 гадоў акадэміку Радзіму Гарэцкаму». «Вось такая гульня лёсу. Дзіўны збег абставінаў», — з іроніяй прамовіў Радзім Гаўрылавіч.

***P. S. Рэдакцыя НЧ сардэчна віншуе шаноўнага Радзіма Гаўрылавіча з юбілеем. Мы зычым яму доўгіх гадоў жыцця, моцнага здароўя, плёну ў працы і ўдзячных вучняў.***

КРУГЛЫ СТОЛ

# АЗДАРАЎЛЕННЕ ФАКТЫЧНА НЕ МАГЧЫМА

Генадзь КЕСНЕР

**У сядзібе Партыі БНФ у Мінску адбыўся «круглы стол» «Забарона на аздараўленне чарнобыльскіх дзяцей за мяжой — удар па будучыні краіны», удзельнікі якога абмеркавалі наступствы ўказа прэзідэнта № 555, які можа стаць прычынай спынення праграм аздараўлення дзяцей з рэгіёнаў, пацярпелых у выніку катастрофы на ЧАЭС, за межамі краіны.**



Старшыня Беларускага дабрачыннага фонду «Дзецям Чарнобыля» Генадзь Грушавы адзначыў, што ўлады ўжо больш за дзесяць гадоў чыняць перашкоды ў дзейнасці арганізацый, якія займаюцца аздараўленнем чарнобыльскіх дзяцей за мяжой. Пасля падпісання кіраўніком дзяржавы ўказу № 555 становішча яшчэ больш пагоршылася. Фармальнай прычынай падпісання дакумента стаў факт невяртання са Злучаных Штатаў школьніцы Таццяны Казыра, якая пажадала там застацца ў гасцявой сям'і (дарэчы, шаснаццацігадовая дзяўчына ўжо вярнулася ў Беларусь).

На думку прафесара Грушавога, нельга стрыгчы ўсе арганізацыі і краіны, што займаюцца дзіцячым аздараўленнем, пад адзін грабенчык: «Мая арганізацыя за дзевятнаццаць год не мела ніводнага такога выпадку. Ці, напрыклад, у Нямеччыне ніколі не было такога, каб дзеці там, умоўна кажучы, гвалтоўна затрымліваліся».

Указ прэзідэнта, па словах Грушавога, рыхтаваўся без кансультацый ці перамоваў з тымі грамадскімі арганізацыямі, якія займаюцца аздараўленнем дзяцей, і ў дакуменце нават не ўзгадваецца пра намер беларускага кіраўніцтва надалей супрацоўнічаць з замежнікамі ў гэтай сферы: «Там ні слова няма, што дзяржава зацікаўлена ў супрацоўніцтве па гэтай праблеме, што яна ставіцца да гэтых праграм з вялікай удзячнасцю, там няма ніводнага слова падзякі тым дзесяткам тысяч дабрачынцаў па ўсім свеце, якія дваццаць год дапамагалі гэтаму народу, гэтай краіне».

Улады, адзначыў Генадзь Грушавы, не спрыяюць ажыццяўленню праграм дапамогі ахвярам чарнобыльскай катастрофы: «Усе гэтыя праграмы здзяйсняе грамадскі сектар. Дзяржава толькі кантралюе. Кантраляваць, рэгуляваць і, пры неабходнасці, забараняць — вось што рабіла дзяржава па гэтых праграмах у апошнія гады».

Да гэтага першы амбасадар незалежнай Беларусі ў Германіі Пётр Садоўскі прыгадаў прыклад з кнігі былога дэпутата Бундэстагу прафесара Эрыкі Шухард «Ціхая рэвалюцыя дзяцей Чарнобыля»:

«Прыязджае баптысцкае дзіця ў Лунінецкі раён і кажа: тата, ты не паліш цыгарэты, не п'еш гарэлку, маці працуе, як немцы, з раніцы да вечара. Мама, тата, чаму гэта мы жывем дрэнна, а немцы жывуць добра? У гэтай фразе квінтэсенцыя, кантрапункт назвы і ўсёй кніжкі. Таму, натуральна, дзяржава абмежавалася функцыяй кантролю».

Як падкрэсліў Генадзь Грушавы, «дзяржава такога кшталту, як наша, заўжды імкнецца да манаполіі на сацыяльную абарону народа, таму што сацыяльная абарона, сацыяльная падтрымка — гэта галоўны інструмент уплыву на грамадскую свядомасць. Калі дапамагае не дзяржава, а дапамагаюць нейкія іншыя структуры, яны аб'ектыўна для гэтых людзей, для гэтага народа з'яўляюцца альтэрнатывай дзяржаве».

У прэзідэнцкім дакуменце ёсць момант, які вымагае для краінаў, якія прымаюць на аздараўленне беларускіх дзяцей, падпісання міжурадавых пагадненняў з Беларуссю па гэтым пытанні. Калі такіх пагадненняў няма, то больш за 30 тысяч дзяцей, якія штогод накіроўваліся за мяжу на аздараўленне праз дабрачынныя арганізацыі, могуць пазбавіцца такой магчымасці.

«Фактычна гэты ўказ — чорным па белым напісаны загад: вось гэтыя 30–35 тысяч дзяцей — гэта заложнікі, — адзначыў старшыня ББФ «Дзецям Чарнобыля». — І пакуль не будзе гэтых пагадненняў, яны так і застануцца ў становішчы інтэрніраваных, яны будуць невыязнымі».

Такія дзеянні беларускіх уладаў выклікалі вялікую занепакоенасць з боку замежных структур, якія займаюцца арганізацыяй аздараўленчага адпачынку чарнобыльскіх дзяцей. «Збянтэжаныя нямецкія цэрквы, напрыклад, у Ніжняй Саксоніі, якія шмат займаюцца такой дапамогай для дзяцей з Гомельскай вобласці, збянтэжаныя грамадскія ініцыятывы па ўсёй Германіі, — сказаў Генадзь Грушавы. — Што датычыць палітыкаў, то яны толькі-толькі пачынаюць усведамляць, што фактычна азначае гэты ўказ беларускага прэзідэнта. І дзякуй Богу — а да мяне ўжо дайшла такая інфармацыя — што з'явіліся некаторыя дэпутаты Бундэстагу, ландтагаў, якія актыўна пачынаюць гэтае пытанне ставіць на палітычным узроўні».

«Калі гаварыць пра юрыдычны аспект гэтага дзіцячага аздараўлення, то датычна Германіі ёсць такі дакумент, як камюніке, што падпісалі яшчэ міністры замежных спраў Кінкель і Краўчанка ў 1993 годзе, і ў гэтым дакуменце ключавымі словамі ёсць «добрая воля», фігуруе нават слова «хрысціянскі», — нагадаў Пётр Садоўскі. — Увесь дакумент гаворыць, што гэта выключна грамадзянская ініцыятыва, маральна-этычны рух, у які ўключыліся людзі добрай волі. Камюніке падпісваюць міністры ўрадаў, але ўвесь змест накіраваны на тое, што гэта не дзяржаўны, а грамадзянскі праект. Да таго ж, кіраўніцтва краіны казала, што нацыянальная ідэя сама па сабе ім неяк не спадабалася, і яны вырашылі хрысціянства, маецца на ўвазе праваслаўе, пакласці ў аснову нацыянальнай ідэі. Атрымліваецца, што і ў маральным аспекце гэты ўказ касуе тую разрэкламаваную дзяржаўную хрысціянскую ідэю, бо гэты рух узнік менавіта як грамадзянская ініцыятыва, у аснове якой ляжыць гатоўнасць дапамагчы бліжняму, хвораму, слабому... Не хацелася тут гаварыць высокія словы, але факт гэты ёсць».

Член-карэспандэнт НАН РБ Іван Нікітчанка заявіў, што неабходна накіроўваць на аздараўленне за мяжу абсалютна ўсіх беларускіх дзяцей, пра што сведчылі даследаванні, праведзеныя ачоленым ім Сацыяльна-экалагічным аб'яднаннем «Цэнтр падтрымкі чарнобыльскіх ініцыятываў»: «Няма ніводнага раёна, дзе б мы не знайшлі радыеактыўных дзяцей. Прычым у зонах, якія лічацца абсалютна чыстымі. У Мінску — кожны трэці, у Горках Горацкага раёну, які абсалютна далёкі ад «зоны», — два з трох, у астатніх раёнах — усе».

Як адзначыў навуковец, «у нас у Беларусі аздараўляць дзяцей няма дзе, а дзецям жа хоць крыху трэба адпачываць. Хранічная радыяцыя згубная для чалавека. У гэтым плане ўсе дакументы, падпісаныя цяперашнім прэзідэнтам, з'яўляюцца антынароднымі, антыканстытуцыйнымі і антызаконнымі».

Былы рэктар Гомельскага мединстытута прафесар Юры Бандажэўскі, пераследаваны ўладамі за свае даследаванні ўплыву малых доз радыяцыі на здароўе людзей, асуджаны да турэмнага зняволення і прызнаны «Міжнароднай амністыяй» «вязнем сумлення» (цяпер ён жыве і працуе ў Еўропе), па зразумелых прычынах не змог прысутнічаць на паседжанні «круглага стала», але даслаў свой выступ у пісьмовым выглядзе. «Умяшанне беларускіх уладаў у працэсы аздараўлення дзяцей за мяжой варта расцэньваць як парушэнне правоў чалавека на абарону свайго здароўя, у прыватнасці, правa асоб, пацярпелых ад Чарнобыльскай катастрофы, ахвяр Чарнобыльскай катастрофы, якое вымагае адэкватнай ацэнкі і рэакцыі з боку Сусветнай супольнасці, у тым ліку аднаго з яе інстытутаў — Камітэта па правах чалавека Арганізацыі Аб'яднаных Нацый», — гаворыцца ў лісце прафесара Бандажэўскага.

Генадзь Грушавы з жалем адзначыў, што на ўказ прэзідэнта № 555 пакуль ніяк не адрэагавалі лідэры палітычных партый, Аб'яднаных дэмакратычных сіл. Выправіць становішча паабяцаў першы намеснік старшыні Партыі БНФ Вінцук Вячорка (сустаршыня палітрады АДС), які, дарэчы, быў мадэратарам гэтага «круглага стала». В. Вячорка выказаў меркаванне, што найбліжэйшым часам улады могуць «адкруціць» назад некалькі пунктаў гэтага ўказу і падаць гэта Захаду як яшчэ адзін крок на шляху лібералізацыі сітуацыі ў Беларусі. Палітык таксама не выключыў магчымасці, што чыноўнікі паспрабуюць узяць у свае рукі ўсе гуманітарныя чарнобыльскія праграмы, уключна дзіцячы аздараўленчы адпачынак у замежжы. «У любых сваіх заявах нам трэба зрабіць акцэнт на тое, што толькі грамадзянская супольнасць, грамадскія арганізацыі ў Беларусі і ў Еўропе маюць патэнцыял і права займацца гэтай дзейнасцю», — падкрэсліў Вінцук Вячорка.

Удзельнікі «круглага стала» вырашылі звярнуцца да лідэраў усіх канфесій, якія ёсць у нашай краіне, каб тыя паспрыялі палягчэнню сітуацыі з дзіцячым аздараўленнем за мяжой. Таксама вырашана правесці абмеркаванні становішча з дзіцячым аздараўленнем у забруджаных рэгіёнах, каб прыцягнуць да вырашэння гэтай праблемы і тых грамадзян, якіх гэтая праблема тычыцца самым непасрэдным чынам. Па словах Вінцука Вячоркі, усе матэрыялы гэтага «круглага стала» будуць выдадзеныя асобнай брашурай і разасланыя ў пацярпелыя ад радыяцыі раёны Беларусі.




«Чарнобыль».

▸ ПОШУКІ І ЗНАХОДКІ

# БРАТЫ ШКЯЛЁНКІ: ПА РОЗНЫЯ БАКІ БЕЛАРУСІ

Сяргей ЧЫГРЫН

**Пяць гадоў таму Беларускае гістарычнае таварыства ў Беластоку выпусціла кнігу гістарычных нарысаў славутага беларускага гісторыка і палітыка Міколы Шкялёнка (1899–1946) пад назвай «Беларусь і суседзі». Я меў да гэтай кнігі непасрэднае дачыненне, бо складаў яе, а таксама шмат гадоў збіраў інфармацыю пра Міколу Шкялёнка. Пошукі звестак пра таленавітага і мужнага сына нашай Бацькаўшчыны працягваю да сённяшніх дзён. І пошукі даюць плён.**

**Сёння на старонках «НЧ» я хачу расказаць пра новыя цікавыя факты з жыцця беларускага юрыста, гісторыка, публіцыста, культурнага і палітычнага дзеяча Міколы Шкялёнка, тым больш што такія факты і звесткі ёсць. Усе фотаздымкі, якія прапаную ўвазе чытачоў газеты, друкуюцца ўпершыню.**



Аляксандра Паўлаўна Шкялёнак (1879–1965) — маці Міколы Шкялёнка.



Мікола Шкялёнак (сядзіць крайні справа) з братамі Паўлам і Пятром, стрыечнай сястрой Раісай і цёткай Кацярынай.



Антон Максімавіч Шкялёнак — родны дзядзька Міколы Шкялёнка разам з жонкаю Кацярынай і дачкою Раісай. Прага, 1925 г.

## З біяграфіі Міколы Шкялёнка

Мікола Шкялёнак нарадзіўся ў 1899 годзе ў вёсцы Пякоціна Міёрскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў юрыдычны факультэт Віленскага універсітэта (1932), быў цесна звязаны з заходнебеларускім нацыянальным рухам — узначальваў Беларускі студэнцкі саюз, уваходзіў у кіраўніцтва Беларускага інстытута гаспадаркі і культуры, Беларускага нацыянальнага камітэта. У 1936 годзе разам з Вінцэнтам Гадлеўскім ён спрычыніўся да заснавання арганізацыі «Беларускі нацыянальны фронт». З 1940 года Мікола Шкялёнак знаходзіўся ў Берліне, там быў адным з арганізатараў Беларускага камітэта самапамачы ў Нямеччыне, рэдагаваў газету «Раніца». З лютага 1943 года працаваў у Мінску ў «Беларускай газеце», якую пасля забойства Уладзіслава Казлоўшчыка рэдагаваў, а са студзеня 1944 года стаў першым віцэ-прэзідэнтам Беларускай Цэнтральнай Рады. Прымаў самы актыўны ўдзел у арганізацыі Другога Усебеларускага кангрэсу, дзе выступіў з дакладам «Аб прызнанні за няважныя пастановы ўраду СССР і былой Польшчы, якія датычацца Беларусі, яе тэрыторыі і народу».

У 1945 годзе Міколу Шкялёнка ў Польшчы высачылі савецкія органы бяспекі, вывезлі ў СССР, дзе ў 1946 годзе расстралялі.

## Пра бацькоў і братоў

Бацькі Міколы Шкялёнка — Восіп Максімавіч і Аляксандра Паўлаўна — мелі каля трыццаці гектараў прыватнай зямлі, трымалі двое коней, сем кароў, авечак, свіней. Уласнымі сіламі ўсё гэта дагледзець яны не маглі, таму наймалі парабкаў. Бацька Восіп Максімавіч быў фізічна здаровым чалавекам. Але аднойчы ён прастудзіўся і памёр ад запалення лёгкіх. Дзяцей мусіла выхоўваць адна маці Аляксандра разам са свёкрам (мужавым бацькам Максімам). Калі памёр бацька, старэйшаму сыну Міколу было толькі 13 гадоў. Маці, вельмі добрая гаспадыня, карысталася ў вёсцы вялікай павагай. Яна пражыла 86 гадоў. І ўсё жыццё чакала сына Міколу, але так і не дачакалася.

У бацькі Міколы Шкялёнка Восіпа было яшчэ два браты — Мікалай і Антон. Антон таксама быў здольны да навукі, ён вучыўся ў Курску і быў спецыялістам-землеўпарадчыкам. Калі Антона забралі ў войска, свой лёс ён звязаў з царскай арміяй. Даслужыўся да штабс-капітана царскай арміі. Адным словам, быў белагвардзейцам і выступаў супраць савецкай улады. У 1920-х гадах з сям'ёй эміграваў у Чэхаславакію, дзе перад другой сусветнай вайной яму эмігранты-белагвардзейцы прысвоілі званне генерала. На радзіму з эміграцыі ніколі не прыязджаў, але прыязджалі яго жонка, казачка Кацярына Пракопаўна, і дачка Раіса. Магчыма, у 1930-х — пачатку 1940-х гадоў дзядзька Антон з Чэхаславакіі сустракаўся са сваім пляменнікам Міколам Шкялёнкам і дапамагаў яму фінансамі і выдаткоўваў грошы на беларускую справу. Мікола шчыра сябраваў з дзядзькам, перапісваўся з ім. На фотаздымку, які сёння публікуецца, напісана: «На памяць дарагому пляменніку Колі ад родных: дзядзькі Антона Максімавіча, цёткі Кацярыны Пракопаўны і сястрычкі Раісы Антонаўны Шкялёнак. 2 лютага 1925 года, Прага». Як склаўся лёс роднага дзядзькі Міколы Шкялёнка — Антона і яго сям'і пасля вайны, — невядома. Можа, гэта публікацыя трапіць у рукі каму са сваякоў Шкялёнкаў у Чэхіі і яны адгукнецца — гэта дазволіць больш даведацца пра лёс сям'і Шкялёнкаў, і ў прыватнасці пра Міколу.

У сям'і Шкялёнкаў, акрамя Міколы, было яшчэ двое сыноў — Пётр (1902–1977) і Павел (1903–1928). Але добрую адукацыю Восіп і Аляксандра Шкялёнкі змаглі даць толькі старэйшаму сыну Міколу.

На Трэцім з'ездзе беларусаў свету, які праходзіў у Мінску 4–7 ліпеня 2001 года, доктар філалагічных навук Аляксей Каўка пазнаёміў мяне з Міхасём Шкялёнкам — сваяком і аднавяскоўцам Міколы Шкялёнка. Міхась Шкялёнак жыў тады ў Маскве, працаваў дырэктарам нейкага прыватнага прадпрыемства. Спадар Міхась расказаў мне трохі пра тое, што ён ведаў ад бацькоў і дзядоў пра свайго знакамітага сваяка. Пазней дасылаў крыху сякіх-такіх звестак, але потым наша сувязь згубілася. Аляксей Каўка неяк напісаў, што фірма Міхася ў Маскве збанкрутавала, а яе гаспадар пераехаў жыць дзесьці ў Падмаскоўе.

## Тэлефонны званок

У пачатку ліпеня ў маёй слонімскай кватэры зазваніў тэлефон. Падымаю трубку і чую немалады голас: «Добры дзень, спадар Сяргей! Мяне завуць Павел Пятровіч Шкялёнак, я — родны пляменнік Міколы Шкялёнка. Хачу вам шчыра падзякаваць за тое, што вы даследуеце жыццёвы шлях майго дзядзькі і выдалі кнігу яго гістарычных артыкулаў у Беластоку». Ад пачутага я атрымаў пэўны шок.

***— Дык вы чый сын? — пытаюся.***

— Я — сын Пятра Шкялёнка — роднага брата Міколы Шкялёнка. Мой бацька пражыў 75 гадоў у роднай вёсцы Пякоціна на Міёршчыне. Працаваў на зямлі. У гады другой сусветнай вайны ён быў на фронце, штурмаў у 1945 годзе Берлін. У гэты час, магчыма, у Берліне быў і Мікола. Так склаўся лёс, што родныя браты былі па розныя бакі барыкад. У гады вайны і пасля вайны браты ніколі так і не сустрэліся. Мой бацька пахаваны ў роднай вёсцы побач з братам Паўлам, дзедам, прадзедам і маёй бабуляй. Крыўдна тое, што ў Беларусі па кожнаму раёну выйшлі з друку кніжкі «Памяць». Падобная кніга выйшла і па Міёрскаму раёну. Але ў спісе ўдзельнікаў вайны мой бацька там не значыцца. 65 гадоў мы нічога не чулі і не ведалі пра Міколу Шкялёнка. Дзякуючы кнізе «Беларусь і суседзі», усе нашы сваякі даведаліся пра лёс нашага роднага чалавека. Вялікі вам дзякуй!

***— Спадар Павел, я не магу так з вамі развітацца, вы павінны адказаць на мае пытанні. Колькі вам гадоў, дзе вы працуеце, жывяце?***

— Я ўжо на пенсіі. Жыў, вучыўся і працаваў у роднай Беларусі. Жыву ў Лагойску Мінскай вобласці.

***— А хоць раз у жыцці вы сустракаліся са сваім дзядзькам Міколам Шкялёнкам?***

— Дзядзьку Міколу я бачыў толькі адзін раз у жыцці, калі ён прыязджаў у вёску Пякоціна да бацькоў прыкладна ў 1937–1938 гадах. Мне тады было гадоў 5–6. Запомніў яго як чалавека, які пакідае добрае ўражанне і адрозніваецца ад усіх вяскоўцаў. Здаваўся высокім, у белым гарнітуры і ў акулярах. Са мной і сястрой ён часам гуляў, рабіў караблікі і спяваў нам беларускія песні, а таксама вучыў нас іх спяваць. Яшчэ памятаю, што прыходзілі сяляне з суседніх вёсак да яго па розныя кансультацыі, найбольш пытанняў у людзей было наконт таго, як пайсці на хутары. Памятаецца да сённяшніх дзён, як дзядзька Мікола прывёз сваёй маці ў падарунак жаночы касцюм і хустку. Мусіць, гэта быў каштоўны падарунак, бо пра яго ўся вёска гаварыла. Гэты касцюм і хустку мая бабуля заўсёды апранала ў царкву і на вялікія святы і ўсё ёй вельмі пасавала.

***— А колькі часу Мікола дома гасцяваў?***

— Быў нядоўга — дзён дзесяць. А потым паехаў у Вільню. Пасля гэтага яго не бачылі ні маці, ні бацька, ні я — ніхто. Ён пісаў толькі лісты, але рэдка. Яны не зберагліся. Дый змест гэтых лістоў я не ведаю.

***— Ці шукалі пасля вайны вы свайго дзядзьку?***

— З пачаткам вайны і пасля вайны наша сям'я ніякай сувязі з Міколам не мела. Толькі мой бацька — брат Міколы — у час акупацыі чуў, што Мікола Шкялёнак працуе ў Беларускай Цэнтральнай Радзе. Дзіўна тое, што мы ў гады вайны жылі ў партызанскай зоне, але гэта інфармацыя не атрымала вялікага розгаласу. А так я і не ведаю, што з намі маглі б зрабіць савецкія партызаны, калі б даведаліся, што Мікола Шкялёнак працуе ў БЦР. Пасля вайны ніхто з нас Міколу не шукаў. За тое яго шукалі іншыя...

***— Больш за ўсё хвалявалася і думала пра сына Міколу яго маці Аляксандра Паўлаўна?***

— Гэта сапраўды так. Дзесьці ў 1965 годзе, незадоўга да яе смерці, а яна заўсёды была пры сваёй памяці, бабуля ўжо ляжала ў ложку. Я нешта пачаў ёй расказваць, а яна слухала-слухала, пасля падняла галаву, паглядзела на мяне (зрок у яе быў ужо дрэнны) і кажа: «Коля, чаму ты так доўга да нас не прыязджаў?..» Мусіць, мой голас нагадаў ёй пра сына Міколу...

***— У вашага бацькі Пятра і ў Міколы Шкялёнкаў быў яшчэ адзін малодшы брат Павел. Чаму ён так рана памёр?***

— Справа ў тым, як расказвала мне мая бабуля, калісьці Шкялёнкі купілі ў пана 20 гектараў зямлі. Але гэтая зямля была забалочаная, зарослая кустоўем, таму яе шмат гадоў уручную ачышчалі. Высякаючы кустоўе, месцамі людзі стаялі ў вадзе. Там працавалі і браты Шкялёнкі. Аднойчы Павел застудзіў ногі і захварэў на туберкулёз ног. Ён доўга хварэў і памёр ва ўзросце 25 гадоў. Дзядзька Павел быў вельмі таленавітым хлопцам, майстрам на ўсе рукі. Сам рабіў музычныя інструменты (гітары, скрыпкі), канапы, этажэркі, добра маляваў, іграў на многіх інструментах. Але сялянскай працы не любіў. Калі ён памёр, на пахаванне прыязджаў Мікола. Мне бацька казаў, што калі хавалі Паўла, над яго магілаю Мікола Шкялёнак сказаў: «Мне вельмі шкада брата Паўліка, але можа ён за нас самы шчаслівы, бо яшчэ невядома, які лёс нас усіх чакае...»

Сапраўды, лёс сям'ю Шкялёнкаў не вельмі песціў. Трагічным ён быў і для беларускага гісторыка і палітыка Міколы Шкялёнка, які хацеў бачыць Беларусь самастойнай, незалежнай і вольнай краінай...

Я яшчэ доўга гутарыў па тэлефоне з Паўлам Шкялёнкам. Цяпер мы з ім перапісваемся і ён шчыра дапамагае мне ў пошуках звестак пра свайго роднага дзядзьку Міколу Шкялёнка.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 8 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

**05.30** Дакументальны фільм «Дзікае паляванне» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свеце матораў.
**09.05, 14.02** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Не нарадзіся прыгожай».
**11.00** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Меладрама «Чырвоны жэмчуг кахання» (Расія - Украіна).
**13.45** «Эканоміка Беларусі». Відэафільм.
**14.05** «Опера - Мадэрн». Канцэртная праграма.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.00** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.00** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50, 02.00** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**23.10** Трылер «Пасярэднік смерці» (Вялікабрытанія).
**01.05** Дзень спорту.
**01.20** Хакей для ўсіх.
**02.50** Усе стыхіі.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** «Дыханне планеты».
**10.45** Ералаш.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Згуба імперыі». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**17.20** «Жарт за жартам».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Футбол. Чэмпіянат Бразіліі».
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Наша справа».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Здаровае дзяцінства».
**14.35** «Крутыя рабяты». Народнае шоў. Паўфінал.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.25** Фільм «Інфант». Расія, 2006г.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.05** «Закон і крымінал».
**00.10** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.20** «Сталічны футбол».
**00.50** «Гучная справа».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Тэлебарометр.
**08.35** Усё аб бяспецы.
**09.00** У гэты дзень.
**09.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**09.55** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Кінааповесць «Развітанне славянкі» (СССР).
**12.10** Гаспадар.
**12.40** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.30** Бухта капітанаў.
**14.30** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**14.55** Пазакласная гадзіна.
**15.05** Гіпноз.
**16.00** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.50** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман».
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.30** Серыял «Ад'ютант яго высакароднасці» (СССР). 1-я серыя.
**23.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**00.00** Хакей. Формула гульні.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.05** Фільм «Арыфметыка кахання».
**10.30** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.25** Фільм «За што?». 1991 г. 1-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Словам адзіным». Уладзімір Дудзінцаў. Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.37** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**20.40** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**21.50** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Печкі-лавачкі» Лідзіі Шукшынай». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.05** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.30** Эксцэнтрычная камедыя «Рататуй».
**15.05** «Рускія не здаюцца!».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «І зноў добры дзень!».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны серыял «Медыум».
**01.05** «Школа зласлоўя».

**09.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Дзень 3-і.
**10.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Канадзе (Лейк-Луіс). Супергігант. Жанчыны.
**11.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**11.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.
**12.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**14.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецыі. Групавы этап. Мужчыны. Швецыя - Шатландыя. Прамая трансляцыя.
**16.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**16.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.
**17.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**20.15** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**00.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**00.45** Футбол. Чэмпіянат свету сярод жанчын да 20 гадоў у Чылі. Фінал.

## 9 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Пастаўскія фарбы» цыкла «Зямля беларуская».
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Анартосіс - Панацінаікас. Прамая трансляцыя.
**23.40** Дзень спорту.
**00.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**01.20** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Групавы этап. Рома - Бардо.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**09.55** «Кашпіроўскі супраць Чумака».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** «Згуба імперыі». Шматсер. фільм.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер.фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсер. фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «След». Шматсер. фільм. 214-я серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.25** «Не жадаю ажаніцца».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.35** Фільм «Інфант». Расія, 2006 г.
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал»
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Рэактыўны бокс».
**01.10** «Надзвычайныя гісторыі».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Серыял «Мяжа. Тайговы раман».
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд.
**12.05** Хакей. Формула гульні.
**12.30** Баявік «Навальнічныя вароты» (Расія). 1-я серыя.
**13.30** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.35** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Бітва экстрасэнсаў.
**16.05** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман».
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.30** Серыял «Ад'ютант яго высакароднасці» (СССР). 2-я серыя.
**23.10** Спорт-кадр.
**23.45** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.05** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**10.00** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г.
**12.30** Фільм «За што?». 1991 г. 2-я серыя.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Я старым не буду. Драма Вампілава». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Вандраванні натураліста».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.37** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**20.40** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**21.50** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** Прэм'ера. «Масква. Пачатак Перамогі». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Y.E.».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**15.20** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Следства вялі...».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

**09.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**10.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**10.45** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецыі. Групавы этап. Жанчыны. Германія - Швецыя. Прамая трансляцыя.
**13.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы.
**14.00** Вось дык так!!!
**14.15** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Групавы этап. Дзень 5-ы.
**15.15** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**16.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецыі. Групавы этап. Мужчыны. Германія - Францыя. Прамая трансляцыя.
**18.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**18.30** Біятлон. Кубак свету ў Швецыі (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Вось дык так!!!
**19.45** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**20.30** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі. Камандныя спаборніцтвы.
**21.00** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі. Камандныя спаборніцтвы.
**21.30** Бокс. Паядынак за тытул Чэмпіёна свету па версіі IBF/IBO у ЗША (Атлантык-Сіці).
**22.00** Бокс. Прамая трансляцыя.
**00.00** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Агляд сезону.
**01.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Агляд.
**02.00** Вось дык так!!!

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 10 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-2» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтарэсаў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.05** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.55** Альманах вандраванняў.
**14.25** Моладзевы серыял «Клініка» (ЗША).
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Ювентус - БАТЭ. Прамая трансляцыя.
**23.40** Дзень спорту.
**00.10** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Агляд дня.
**01.30** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Дынама (Кіеў) - Фенербахчэ.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсерыйны фільм «Ключы ад смерці».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм. 215-я серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм.
**00.25** Тэорыя неверагоднасці. «Каханне і сэкс».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Зоркі спорту».
**01.05** «Дэтэктыўныя гісторыі».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія).
**09.20** У гэты дзень.
**09.25** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.05** Свая музыка.
**11.35** Пасоўванне +.
**12.05** Спорт-кадр.
**12.30** Баявік «Навальнічныя вароты» (Расія). 2-я серыя.
**13.25** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.15** Мультфільм.
**14.45** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.10** Пазакласная гадзіна.
**15.20** «Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.10** Калыханка.
**21.30** Серыял «Ад'ютант яго высакароднасці» (СССР). 3-я серыя.
**23.05** «Іншыя». «Сякерная праца».
**23.40** Фільм-прыпавесць «Бунюэль і стол цара Саламона» (Іспанія-Мексіка- Германія).

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Дэтэктыў «Заснулы пасажыр». 1993 г.
**08.35** Мультфільмы. «Казка пра казявачку».
**08.50** «Студыя Здароўе».
**09.25** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**10.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** «Леанід Быкаў. На апошнім дыханні». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага-3. Фільм 4. «Пярэварацень». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Целаахоўнік». 1991 г.
**16.20** Прэм'ера. «Аншлаг і Кампанія».
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** Фільм «Ты заўсёды будзеш са мной», Расія, 2007 г.
**22.10** Прэм'ера. «Імя Расія».
**23.20** Фільм «Аляска, сэр!». 1992 г.
**01.20** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Дачны адказ».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Пакой адпачынку».
**10.50** «Галоўная дарога».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Y.E.».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**15.20** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.35** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Залатая качка».
**23.00** Сёння.
**23.30** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

**09.30** Вось дык так!!!
**10.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Агляд.
**11.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецы. Групавы этап. Мужчыны. Германія - Швецыя. Прамая трансляцыя.
**13.00** Біятлон. Кубак свету ў Швецы (Остэрсунд). Мужчыны. Гонка пераследу.
**13.45** Біятлон. Кубак свету ў Швецы (Остэрсунд). Жанчыны. Гонка пераследу.
**14.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**16.00** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецы. Групавы этап. Жанчыны. Шатландыя - Германія. Прамая трансляцыя.
**18.00** Самыя моцныя людзі планеты. Ліга чэмпіёнаў (Украіна).
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.15** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Ірландыі.
**19.45** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Ірландыі.
**20.15** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецы. Групавы этап. Прамая трансляцыя.
**23.00** Абранае па серадах.
**23.05** Конны спорт. Топ 10 (Брусэль, Бельгія).
**00.05** Навіны коннага спорту.
**00.10** Гольф-клуб.
**00.15** Ветразны спорт. Volvo Ocean Race.
**00.45** Яхт-клуб.
**00.50** Абранае па серадах.
**01.05** Вось дык так!!!
**01.30** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Агляд.

## 11 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

**05.15** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Зямельнае пытанне.
**09.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10-15.00** Прафілактыка .
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.30** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтарэсаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50, 01.50** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**23.10** Псіхалагічная драма «72 метры» (Расія).
**01.35** Дзень спорту.

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**10.00** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсерыйны фільм «Ключы ад смерці».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?», 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсерыйны фільм.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Сінія ночы». Шматсерыйны фільм. Заключная серыя.
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм. 216-я серыя.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсерыйны фільм.
**00.25** «Дакументальны дэтэктыў».
**01.00** Нашы навіны.
**01.15** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Дабро пажаліцца».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Дэтэктыўныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Добры дзень, доктар!».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Малая Радзіма».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Асабісты інтарэс».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Гарачы лёд».
**01.10** «Сакрэтныя гісторыі».

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.15** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія).
**09.10** У гэты дзень.
**09.15** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.00** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Невытлумачальна, але факт.
**11.45** Медычныя таямніцы.
**12.15** Баявік «Навальнічныя вароты» (Расія). 3-я серыя.
**13.10** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.00** «Спорт, спорт, спорт...».
**14.40** Мультсерыял «Сонік Ікс» (Японія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** Танцы без правіл.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Серыял «Мяжа. Тайговы раман» (Расія). Заключная серыя.
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.30** Серыял «Ад'ютант яго высакароднасці» (СССР). 4-я серыя.
**23.00** «Проста праграма».
**23.45** Трагікамедыя «Чамскрабер» (ЗША-Германія).

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**10.05** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа».
**11.00** Весткі.
**11.30** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г.
**12.30** Камедыя «Рускі цуд». 1994 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Савецкая імперыя. «Радзіма-Маці». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Формула ўлады».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.37** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**20.40** Тэлесерыял «Сустрэчная паласа». 2008 г.
**21.47** Тэлесерыял «Жанчыны ў гульні без правіл», Расія, 2004 г.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** Прэм'ера. «Слова. Да 90-годдзя А.І. Салжэніцына». Дакументальны фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Прафесія-рэпарцёр».
**09.10** «Залатая качка».
**10.00** Сёння.
**10.20** Да 90-годдзя А.І. Салжэніцына. «... Можа быць, мая мэта неспасцiжная...».
**10.50** «Барацьба за ўласнасць».
**11.20** Дэтэктыўны серыял «Y.E.».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР».
**15.20** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.45** «Да бар'ера!». Ток-шоў.
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

**09.30** Аўтаспорт. Чэмпіянат свету ў класе «Турынг». Агляд сезону.
**10.30** Кёрлінг. Чэмпіянат Еўропы ў Швецы. Групавы этап. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**12.00** Ралі. Чэмпіянат свету. «Ралі Вялікабрытаніі». Агляд.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**14.30** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету ў Бельгіі.
**15.30** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету ў Бельгіі.
**16.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе ў Харватыі. Дзень 1-ы.
**17.30** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе ў Харватыі. Дзень 1-ы. Прамая трансляцыя.
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Навіны.
**19.45** Фігурнае катанне. Паказальны выступ (Інгольштат, Германія).
**21.45** Бокс.
**23.45** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб.
**01.00** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Групавы этап. 6-ы дзень.

## 14 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

### 1

**06.50** Моладзевы серыял «Сэрца акіяну» (Францыя).
**07.15** Меладрама «Дзяўчынка з горада» (СССР).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05, 12.10** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.10** Культурныя людзі.
**10.50** Усе стыхіі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.15** Камедыйная меладрама «Дзеці Дон Кіхота» (СССР).
**13.55** «Будні чэмпіёнаў». Спартовыя танцы.
**14.25** «Прабач мяне». Відэафільм АТН.
**15.10** Навіны рэгіёна.
**15.30** Nota Bene.
**16.00** КВЗ. 1/2 фіналу Еўралігі. 2-я гульня.
**17.50** Суперлато.
**18.50** Прэм'ера. Авантурная меладрама «Аферысты» (Расія-Украіна).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.35** Футбол. Ліга чэмпіёнаў. Відэачасопіс.
**23.05** Псіхалагічная драма «Мора ўсярэдзіне» (Францыя-Італія-Іспанія).

### ОНТ

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** Разумніцы і разумнікі.
**12.25** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.05** «Дарослыя казкі аб жывёлах». Дакументальны фільм.
**13.35** «Зваротны адлік».
**14.05** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Міжнародная панарама».
**16.40** Тэорыя неверагоднасці.
**17.25** Нядзельны «Ералаш».
**17.35** Прэм'ера. «Агульная тэрапія». Шматсерыйны фільм. 12-я серыя. Заключная.
**18.40** Прэм'ера АНТ: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**20.00** Контуры.
**21.05** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**21.40** Прэм'ера. «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.55** Фільм «Вяртанне».
**01.05-01.40** «Камедзі Клаб».

### СТВ

**07.20** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.45** Фільм «Хлопец з белай ракі». ЗША, 1999г.
**09.25** «Аўтапанарама».
**09.55** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.35** «Добры дзень, доктар!».
**13.10** Фільм «Вязень замка Іф». СССР, 1988г. 2-я серыя.
**14.40** «Дарагая перадача».
**15.00** «Культурнае жыццё».
**15.30** «Прыватныя гісторыі».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Уваскрэсенне класікі». Дыялогі аб музыцы.
**17.55** «Фантастычныя гісторыі».
**19.00** «Аўтапанарама».
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Ход каралевай». Германія-ЗША, 1992 г.
**22.45** «Спартовы тыдзень».
**23.15** СТБ прадстаўляе: група «Лепрыконсы» - «Канцэрт «Без даты».
**00.35** «Сакрэтныя матэрыялы». Серыял.

### ЛАД

**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.15** Прыгодніцкі мультфільм «Тагер: Джып, які жадаў лётаць» (ЗША).
**11.20** Медычныя таямніцы.
**11.55** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Мужчыны. Прамая трансляцыя.
**13.40** Пасоўванне +.
**14.00** Слова пісьменніка.
**14.25** «Спявай, душа. by». Ансамбль «Выцінанка» (г. Столін).
**15.10** Біятлон. Кубак свету. Эстафета. Жанчыны. Прамая трансляцыя.
**16.50** «Спорт, спорт, спорт...».
**17.25** Гандбол. Чэмпіянат Еўропы. Жанчыны. Фінал. Прамая трансляцыя.
**19.00** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**20.20** Тэлебарометр.
**20.40** Правы чалавека.
**20.55** Прэм'ера. Меладрама «Калі я быў спеваком» (Францыя).
**23.10** Свая музыка.
**23.40** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Экстраліга. Керамін (Мінск) - Металург (Жлобін).
**01.35** Пасоўванне +.

### РОССИЯ

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Экранізацыя рамана «Чырвонае і чорнае». 1976 г. 4-я серыя.
**08.25** Мультфільмы. «Гаршчок смеху «.»Вожык і дзяўчынка».»Кураня ў клетачку».
**08.50** «Студыя Здароўе».
**09.25** «Дзяжурны па краіне».
**10.25** «Гарадок». Дайджэст. Забаўляльная праграма.
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Прэм'ера. «Асцярожна, мозг!». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага-3. Фільм 2. «Залаты стрэл». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны - 3». 1992 г.
**16.20** Прэм'ера. «Смяяцца дазваляецца». Гумарыстычная праграма.
**18.25** «Сумленны дэтэктыў».
**19.00** Весткі тыдня.
**20.05** Фільм «Вяртанне блуднага таты». 2006 г.
**22.10** Прэм'ера. «Імя Расія».
**23.20** Вострасюжэтны фільм «Амерыкэн бой». 1992 г.
**01.25** Заканчэнне эфіру.

### НТВ

**07.30** Мультфільмы.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.25** «Авіятары».
**12.00** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.10** Крымінальная камедыя «Бастар».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Барацьба за ўласнасць».
**17.00** Дэтэктыўны серыял «Злачынства будзе раскрыта».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.10** «Галоўны герой».
**22.20** «Рускія не здаюцца!».
**23.00** «Наша тэма».
**23.30** Фантастыка «Пустэча».

### EUROSPORT

**09.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). Кваліфікацыя. HS 140.
**10.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Іспаніі. Жанчыны. Слалам. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**11.15** Санкавы спорт. Кубак свету ў Германіі (Вінтэрберг). Жанчыны. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
**13.30** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). Кваліфікацыя. HS 140. Прамая трансляцыя.
**15.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Жанчыны. Эстафета. Прамая трансляцыя.
**16.45** Аўтаспорт. Кубак нацый. Гонка чэмпіёнаў (Лондан, Вялікабрытанія). Прамая трансляцыя.
**18.00** Плаванне. Чэмпіянат Еўропы на кароткай вадзе ў Харватыі. Дзень 4-ы. Прамая трансляцыя.
**19.30** Аўтаспорт. Кубак нацый. Гонка чэмпіёнаў (Лондан, Вялікабрытанія). Прамая трансляцыя.
**21.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Дзень 2-і. Прамая трансляцыя.
**00.00** Зімовыя віды спорту. Агляд снежнага ўік-энду.
**00.30** «Аўта і мотаспорт». Штогадовая цырымонія ўручэння прызоў у аўта і мотаспорце (Манака).
**01.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хохфільцэн). Мужчыны. Эстафета.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» распачынае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прапісам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ______ (по реестру ф. 11)
№ ______ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты “Новы час”

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ______ руб.
______ (сумма прописью)
Кому Куда Г-та “Новы час”, р/с 3012211080010 фил. МГДОАО “Белинвестбанк”, код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11
От кого ______
Адрес ______ (почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
(фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|

Период подписки указывает абонент
Плательщик
Пеня ______
Всего ______
Кассир

ЦІКАВА

# ПАСЛЯ ДАЛАЙ ЛАМЫ

Іван БІЧ

**У Дхарамсале, што на поўначы Індыі, закончыліся зборы тыбецкай эміграцыі, удзельнікі якіх абмеркавалі перспектывы руху за незалежнасць краю.**



Усяго ў мерапрыемстве ўдзельнічалі 660 прадстаўнікоў розных арганізацый і грамад. Яны прадстаўлялі прыблізна 15 палітычных платформ, якія існуюць зараз у тыбецкім руху.

Галоўным пунктам у павестцы дня было абмеркаванне новай сітуацыі, у якой тыбецкі рух апынуўся пасля краху курсу так званага «Сярэдняга шляху». Прынцыпы курсу «Сярэдняга шляху» былі сфармуляваныя Далай Ламай у 1987 годзе ў Страсбургскай заяве. Яе сутнасць — барацьба за незалежнасць Тыбету павінна ісці выключна мірным шляхам. Больш за тое, Далай Лама не выключаў гатоўнасці адмовіцца ад лозунгу патрабавання поўнай дзяржаўнасці ў абмен на шырокую нацыянальна-культурную аўтаномію для Тыбету ў складзе Кітайскай народнай рэспублікі (КНР).

З тых часоў эмігранцкі ўрад спрабуе весці з Пекінам дыялог. Аднак некалькі тыдняў таму на ідэі перамоваў быў пастаўлены крыж. Эмісар тыбетцаў, які адказваў за сакрэтныя перамовы з кітайцамі, вярнуўся з КНР, дзе яго адкрытым тэкстам інфармавалі: кітайскі бок прыпыняе ўсялякія кансультацыі з тыбецкай эміграцыяй. Праз некаторы час Далай Лама звярнуўся да сяброў дыяспары з заявай, у якой прызнаў правал прапанаванай калісьці тактыкі. Ён таксама заклікаў прадстаўнікоў дыяспары сабрацца і абмеркаваць перспектывы руху.

Зборам папярэднічала апытанне ўсіх сяброў эміграцыі — як яны ставяцца да курсу «Сярэдняга шляху». Было апытана 17 тысяч чалавек. З іх восем тысяч заявілі, што гатовыя падтрымаць любую палітыку, калі яе праводзіць Далай Лама. Пяць тысяч выказаліся супраць таго, каб рабіць ідэю незалежнасці прадметам гандлю. Дзве тысячы выступілі за працяг спробаў наладзіць дыялог з Пекінам.

Паленіка на канферэнцыі ў Дхарамсале была вельмі гарачай. Надзвычай актыўна паводзіла сябе апазіцыя, прадстаўленая групоўкамі «Тыбецкі моладзевы кангрэс» (ТУС) і «Студэнты за вольны Тыбет».

ТУС быў заснаваны яшчэ ў 1970 годзе з падачы Далай Ламы, аднак з часам аб'яднаў яго праціўнікаў, якія выступаюць за больш радыкальныя формы барацьбы. Не дзіўна, што рэакцыяй на прынцыпы Страсбургскай заявы стала чыстка апарату тыбецкай адміністрацыі ад сяброў ТУС, якім не падабаўся пацыфісцкі характар курсу Сярэдняга шляху. Старшыня «Тыбецкага моладзеага кангрэсу» не выключае правядзенне сябрамі арганізацыі акцый тэрору супраць кітайскіх уладаў. Гэта дало Пекіну падставу ўнесці ТУС у спіс тэрарыстычных арганізацый.

Іншая апазіцыйная Далай Ламе фармаванне — «Студэнты за вольны Тыбет» — нарадзілася ў 90-я гады ў ЗША як праваабарончай рух моладзі за правы тыбетцаў. Арганізацыя вядомая сваімі відовішчнымі тэатральнымі акцыямі. Напрыклад, актывісты неяк павесілі транспарант з заклікам надаць Тыбету свабоду на Вялікай кітайскай сцяне.

Доўгі час «Тыбецкі моладзевы кангрэс» і «Студэнты за вольны Тыбет» знаходзіліся ў цені палітыкі Далай Ламы, якога ахвотна падтрымлівалі вядомыя грамадскія і культурныя дзеячы. Стан рэчаў змянілі падзеі апошняй вясны. Арганізацыі ігнаравалі заклік Далай Ламы не выкарыстоўваць тэму Алімпіяды, якая мела адбыцца ў Пекіне, у палітычных мэтах. Наадварот, яны сталі ініцыятарамі сусветных пратэстаў супраць рытуалу пераносу алімпійскага факела. Кампанія мела вялікі рэзананс. Варта дадаць, што кітайскія спецслужбы спрабавалі нейтралізаваць дзейнасць праціўнікаў Алімпіяды, аднак беспаспяхова.

Алімпійскія пратэсты ўзнялі рэйтынг апазіцыі Далай Ламе. Галоўнае патрабаванне гэтай фракцыі — ніякіх кампрамісаў у пытанні права тыбетцаў на незалежнасць. На думку радыкалаў, толькі праз сталы ціск на Пекін можна дасягнуць нейкіх зменаў.

Наколькі ім удалося паўплываць на перспектывы мадэлі тыбецкага супраціву, будзе вядома ў сакавіку, калі ў той жа Дхарамсале збярэцца эміграцыйны парламент і на базе матэрыялаў канферэнцыі прыме нешта накшталт праекту канцэпцыі тыбецкага руху на бліжэйшы час.

Хаця афіцыйна большасць дэлегатаў падтрымала ідэю палітыкі «Сярэдняга шляху», як заявіў старшыня парламенту, шмат дэлегатаў канферэнцыі заклікалі, каб урад выступіў з ультыматумам на адрас Пекіну. Галоўны пасыл — калі Пекін не вернецца за стол перамоваў, тыбетцы будуць шукаць іншыя формы барацьбы. Знак гатоўнасці да дыялогу — вызваліць усіх палітычных вязняў.

З іншага боку, вяртанне да гвалтоўных метадаў змагання можа каштаваць тыбетцам падтрымкі міжнароднай супольнасці.

Нягледзячы на відавочныя поспехі апазіцыі, сам Далай Лама можа быць задаволены вынікамі канферэнцыі. Яна аб'яднала тыбецкі рух і прадэманстравала, што нават у выпадку смерці Далай Ламы эміграцыя застанецца кансалідаванай, будзе мець пэўныя інстытуты прыняцця рашэнняў і іх рэалізацыі.

Гэты аспект вельмі важны. Далай Ламе зараз ужо 73 гады. Сам Далай Лама пакуль не вызначыўся, што будзе сабой уяўляць інстытут Далай Лам пасля яго смерці. Ён нават увогуле гатовы стаць апошнім Далай Ламай, калі будысцкая грамада не паўстане супраць. Аднак шмат хто лічыць, што ў выніку ён аддасць перавагу інстытуту рэгенцтва, што дазваляецца рэлігійным канонам. Ужо называюцца некалькі кандыдатаў на гэты пасаду. У любым выпадку, прагназуецца, што новы Далай Лама будзе адыгрываць больш духоўную, чым палітычную ролю. Галоўнае тут, аднак, у тым, што смерць Далай Ламы, як паказала канферэнцыя, не справакуе расколу і крызісу эміграцыі — пра што марыць Пекін. Сімвалічна, дарэчы, што сам Далай Лама не прысутнічаў на канферэнцыі, аддаючы ініцыятыву новым палітыкам.

Што да рэакцыі Пекіну на мерапрыемства, яна была занадта жорсткай. Натуральна, Пекін апрыёры не вызнаў вынікі канферэнцыі. На думку кітайскіх чыноўнікаў, канферэнцыя прадстаўляе выключна волю жменькі клерыкалаў. Больш за тое, напярэдадні кітайскі МЗС спрабаваў чыніць ціск на Дэлі, патрабуючы, каб індыйцы забаранілі правядзенне збораў. Пасля таго, як індыйскі ўрад адмовіў, кітайцы на час канферэнцыі прывялі ў баявы стан вайсковыя фармаванні на кітайска-індыйскай мяжы.

Трывога Пекіну зразумелая. Хваляванні ў сакавіку 2008 года ў Тыбеце давялі, што палітыка дыктату выклікае ў тыбетцаў не лаяльнасць, а хутчэй фрустрацыю, якая гатовая ў нейкі дзень выліцца ў адкрытыя акцыі пратэсту. Вялікую ролю ў тым, што кітайская адміністрацыя ў Тыбеце ў масавай свядомасці застаецца не легітымнай, адыгрывае факт існавання па той бок Гімалаяў арганізаванай эміграцыі.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Каментуючы сітуацыю ў галіне інвестыцый і наступстваў крызісу, незалежныя эксперты нагадваюць, што эканоміка краіны, якая не рэфармаваная, не рэнтабельная і кіруецца адміністратыўнымі метадамі, была не эфектыўная яшчэ да пачатку крызісу. Крызіс зрабіў сітуацыю толькі яшчэ больш нестабільнай. На іх думку, разлік на тое, што баланс могуць выправіць іншаземныя інвестыцыі, не мае падстаў. Рэальных прыватызацыйных працэсаў і рынкавых рэформ у краіне няма, а ўзровень бюракратыі сістэмы гаспадаркі занадта высокі, каб сюды маглі інвеставаць нават самыя зацікаўленыя інвестары.

**«Независимая газета» (Расія)**

Адзначым, што ў Беларусі крызіс, хаця і не мае такой формы, як ва Украіне (абвал нацыянальнай валюты, масавыя звальненні, скарачэнні заробкаў), падобны на агульную схему: скарачаецца экспарт, буксуе прамысловасць, банкі не даюць крэдыты, замарожаныя шматлікія будоўлі. З часам краіна гэта адчуе. Лукашэнка, здаецца, думае, што краіне хопіць крэдытаў, каб пражыць цяжкія часы, а там, магчыма, эканоміка неяк сама пойдзе на папраўку.

**«Сегодня» (Украіна)**

Беларусь, якая мае імідж апошняй дыктатуры Еўропы, паступова змяняе яго. Ёсць перадумовы эканамічных дывідэндаў: у Лондане паспяхова прайшоў Беларускі інвестыцыйны форум, па выніках якога Беларусь мае планы прыцягнуць мільярд замежных інвестыцый. На самай справе, тое, што адбываецца, не павінна выклікаць здзіўлення. Захад і Лівія таксама зблiжаюцца апошніх пяць гадоў. Дык чаму не ўладкаваць адносіны і з Беларуссю? Любімая гульня Захаду — разборкі вакол таго, хто дэмакрат, а хто не дэмакрат, — здаецца, надакучыла найбольш заможнай частцы насельніцтва.

**«Росбалт» (Расія)**

Беларускі лідэр добра ведае, што расійская эліта не гатовая даць Лукашэнку нейкае адпаведнае яго статусу месца ў саюзнай дзяржаве. Таму зараз задача Лукашэнкі: з аднаго боку, не дапусціць таго, каб гэты праект памёр цалкам, а з другога — каб Беларусь стала часткай Расіі, а ён пазбавіўся асабістай улады. Што тычыцца Масквы, то яна патрабуе, каб Лукашэнка дэмакратызаваў грамадства. Прычым відавочна, што калі Лукашэнка і не падабаецца, то расійцам капаць пад яго рэжым дастаткова небяспечна: невядома, каго паставіць на яго месца. Пакуль кандыдатур на самай справе няма.

**«Сегодня.Ру» ( Расія)**

Маскве яўна не падабаецца нежаданне Беларусі на аснове нейкіх прыдуманых падстаў не прызнаваць незалежнасць Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. У Крамлі, відавочна, лічаць, што Мінск проста не жадае сапсаваць адносіны з Захадам. Дарэчы, нагадаем, што Лукашэнку далі крэдыт у адзін мільярд долараў. І гэта не апошняе ўліванне для абароны беларускай гаспадаркі ў апошні час. Аднак дружба не становіцца больш цеснай. У такім выпадку, нашто Расіі не вельмі адданы саюзнік?

**«Политком» (Расія)**

Іншаземныя кампаніі хацелі б пачаць тут працаваць. Аднак Беларусі трэба спачатку вырашыць праблему іміджу. Справа ў тым, што ў Беларусі кіруе апошні дыктатар у Еўропе.

**«Financial Times Deutschland» (Германія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЕЎРАСАЮЗ

Міністры эканомікі 15 краін Еўрасаюза, якія перайшлі на адзіную еўрапейскую валюту — еўра, падтрымалі прапанаваны Еўракамісіяй план уздыму эканомікі ЕС, паведамляе «РИА Новости».

Старшыня еўрагрупы, прэм'ер-міністр і міністр фінансаў Люксембурга Жан-Клод Юнкер казаў пра неабходнасць асобных нацыянальных антыкрызісных планаў. Як зазначаюць еўрапейскія эканамісты, у выпадку рэалізацыі плана асноўная фінансавая нагрузка ляжа менавіта на самыя развітыя краіны ЕС: Вялікабрытанію, Германію, Італію і Францыю.

Еўракамісія для ўздыму эканомікі ЕС прапанавала фінансавы стымул у 200 мільярдаў еўра, з якіх 170 мільярдаў выдзеляць сябры ЕС, а 30 мільярдаў пойдзе з агульнага бюджэту ЕС. У нацыянальным зрэзе размова ідзе аб сродках, што эквівалентныя 1,2 працэнта ВУП.

### ПОЛЬШЧА

Да 2020 года Польшча плануе пабудаваць на сваёй тэрыторыі атамную электрастанцыю, каб перайсці на танныя і чыстыя энергарэсурсы, заявіў 1 снежня прэм'ер-міністр Польшчы Дональд Туск.

Як паведамляе агенцтва «Франс Прэс», польскі кіраўнік урада разлічвае, што адпаведнае рашэнне ўладаў будзе неўзабаве прынята. Зараз 94 працэнта энергіі краіны паступае з каменнавугальных цеплавых электрастанцый. Пры гэтым выкіды вуглякіслага газу ў Польшчы штогод удвая перавышаюць еўрапейскія нормы.

Польшча далучылася да планаў Літвы, Латвіі і Эстоніі аб будаўніцтве новай АЭС на літоўскай тэрыторыі.

### РУМЫНІЯ

Левая Сацыял-дэмакратычная партыя атрымала перамогу на парламенцкіх выбарах у Румыніі, паведамляе «РИА Новости».

Сацыял-дэмакраты набралі 36 працэнтаў галасоў, у той час як Дэмакратычна-ліберальная партыя правага кірунку атрымала 31 працэнт галасоў, а кіруючая Нацыянал-ліберальная партыя Румыніі — 20 працэнтаў галасоў.

Парламенцкія выбары адбыліся ў Румыніі 30 лістапада. Каля 18 мільёнаў чалавек прынялі ўдзел у выбарах дэпутатаў ніжняй палаты і сенатараў.

Асноўнымі сапернікамі з'яўляліся Нацыянал-ліберальная партыя на чале з прэм'ер-міністрам Кэлін Папеску-Тэрычану, Сацыял-дэмакратычная партыя і Дэмакратычна-ліберальная партыя. Акрамя таго, у вырабах удзельнічаў Дэмакратычны саюз венграў Румыніі, які з 1996 года праходзіў ва ўсе парламенты.

Грамадзянам Румыніі ўпершыню прыйшлося галасаваць не за партыйныя спісы, а за канкрэтных кандыдатаў.

### УКРАІНА

Украіна можа адмяніць бязвізавы рэжым для грамадзян Еўрасаюза, калі ЕС не створыць адпаведны рэжым для Украіны. Пра гэта заявіў кіраўнік сакратарыяту прэзідэнта Віктар Балога ў інтэрв'ю тэлеканалу ICTV 30 лістапада, паведамляе выданне «Украінская праўда».

Паводле яго слоў, калі Украіна ў 2005 годзе ўвяла бязвізавы рэжым для грамадзян краін ЕС, то, «безумоўна, як кіраўніцтва Украіны — прэзідэнт, Вярхоўная рада, урад, так і грамадзяне Украіны чакаюць адпаведнай рэакцыі з боку Бруселя».

Прайшло ўжо больш за тры гады, зазначыў В. Балога, і «Украіна спадзяецца, што ў найбліжэйшай перспектыве гэтае пытанне будзе знята з парадку дня». «У адваротным выпадку нам таксама трэба будзе перагледзець сваю пазіцыю адносна прынятага ў 2005 годзе рашэння», — заявіў прадстаўнік прэзідэнта Украіны.

8–9 снежня ў Кіеве адбудзецца чарговае пасяджэнне камісіі Украіна — ЕС па пытаннях бязвізавага дыялогу. Украіна прапаноўвае ЕС на гэтым этапе адмяніць плату за візы для украінскіх грамадзян.

### ПОЛЬШЧА

1 снежня ў Познані пачаўся 12-дзённы саміт пад эгідай ААН, падчас якога прадстаўнікі 186 краін паспрабуюць узгадніць шляхі барацьбы з глабальным пацяпленнем, перадае Бі-бі-сі.

Эксперты не чакаюць, што падчас перамогу будуць дасягнутыя канкрэтныя пагадненні. Бакі плануюць заявіць аб сваіх інтарэсах па асноўных экалагічных праблемах і ўнесці прапановы па іх вырашэнні.

Між тым, Еўрасаюз заклікае свет да 2020 года скарачаць выкіды парніковых газаў на 20 працэнтаў у параўнанні з узроўнем 1990 года.

Міжнародная супольнасць мае намер у 2009 годзе заключыць новае пагадненне аб барацьбе з выкідамі, якое набудзе моц у 2012-м, гэта значыць пасля заканчэння тэрміну дзеяння Кіёцкага пратакола. Саміт у Познані павінен стаць паваротным пунктам, калі краіны перастануць абменьвацца агульнымі пажаданнямі і пачнуць канкрэтныя перамовы, лічаць эксперты.

### ВЯЛІКАБРЫТАНІЯ

Глабальны фінансавы крызіс уносіць «радыкальныя змяненні» ва ўспрыманне брытанцамі адзінай еўрапейскай валюты — еўра, дэманструючы яе значнасць, лічыць старшыня Еўракамісіі Жазэ Мануэл Барозу.

Як паведамляе *«РИА Новости»*, пагаршэнне эканомікі Вялікабрытаніі і рэзкае зніжэнне працэнтных ставак Банкам Англіі прывяло да падзення курсу нацыянальнай валюты — англійскага фунта стэрлінгаў — да рэкорднага мінімуму ў адносінах да еўра.

Зазначыўшы, што большасць жыхароў Вялікабрытаніі выступаюць супраць уваходжання іх краіны ў зону еўра, кіраўнік Еўракамісіі заўважыў журналістам, што, тым не менш, «перыяд абдумвання ўжо пачаўся», і брытанцы «цяпер думаюць над гэтым».

КАНГРЭС

# ЛАЛІТА НЕ ПРОЙДЗЕ

*Алег ПЯТРОЎ*



**У Рыо-дэ-Жанейра пад эгідай ААН пачаў працу сусветны кангрэс, прысвечаны барацьбе з дзіцячай парнаграфіяй.**

Кожны год па ўсяму свету ахвярамі сексуальнага гвалту становяцца 150 мільёнаў дзяўчынак і 73 мільёны хлопчыкаў. Такія лічбы прыводзіцца ў рапарце ААН за 2006 год. Безумоўна, адзін з фактараў і спадарожнікаў феномену сексуальнага гвалту ёсць шалёны рост індустрыі дзіцячай парнаграфіі. З 1997 года колькасць парнаграфічных карцінак з удзелам дзяцей у інтэрнэце вырасла ў 1500 разоў. Кожны дзень у інтэрнэце з'яўляецца 200 новых матэрыялаў падобнай катэгорыі. Адначасова, як заключыла арганізацыя Internet Watch Foundation, у гэтай масе змяшчаецца ўсё больш адкрыта садысцкіх здымкаў. Сябрамі педафільскіх сецей, якія вырабляюць і распаўсюджваюць такога кшталту прадукцыю, па ўсяму свету з'яўляюцца прыблізна сто тысяч чалавек. Застаецца дадаць, што штогадовы абарот грошай у гэтым бізнесе складае прыблізна 18 мільярдаў долараў ЗША.

У кантэксце пазначаных вышэй лічбаў не дзіўна, што Кангрэс па барацьбе з дзіцячай парнаграфіяй у Бразіліі наведалі шматлікія аўтарытэтныя палітыкі, напрыклад, каралева Швецыі ды прэзідэнт Бразіліі. Усяго ў мерапрыемстве бяруць удзел тры тысячы чалавек з 125 краін свету.

Гэта трэцяя такога кшталту канферэнцыя. Першая адбылася ў Стакгольме ў 1996 годзе, другая — у Йакагаме ў 2001-м. З тых часоў шмат што змянілася. Тэма перастала быць табу: усе краіны быццам вызналі значэнне праблемы.

**У большасці крымінальных кодэксаў краін свету пад дзіцячай парнаграфіяй разумеюць публічную дэманстрацыю візуальнай прадукцыі з выявай сексуальных практык з удзелам дзяцей**

Галоўным прарывам стала спроба стварэння прававой базы для барацьбы з гэтым відам злачынства. У шматлікіх краінах свету прынятыя адпаведныя законы. Аднак трэба прызнаць, што універсальнай дэфініцыі, што ёсць дзіцячай парнаграфіяй, і, адпаведна, адзінай методыкі барацьбы з ёй дасюль няма.

У большасці крымінальных кодэксаў краін свету пад дзіцячай парнаграфіяй, груба кажучы, разумеюць публічную дэманстрацыю візуальнай прадукцыі з выявай сексуальных практык з удзелам дзяцей. Мова звычайна ідзе пра графічныя матэрыялы, аднак, напрыклад, у Швецыі ў гэтую катэгорыю могуць патрапіць таксама тэксты. Праўда, забараніць «Лаліту» Набокава не пасмеў ніхто.

Працягваецца дыскусія — ці можна адносіць да дзіцячай парнаграфіі працы мастакоў, якія сцвярджаюць, што жадалі проста паказаць прыроду сексуальнасці. У Германіі, напрыклад, не рызыкуюць заносіць у каталог забароненых малюнкаў працы вялікага мастака Генрыха Зілле, які на пачатку XX стагоддзя рабіў натуралістычныя замалёўкі сцэн паўсядзённага жыцця бедных немцаў, у тым ліку і дзяцей. У ЗША ўжо мелі месца судовыя працэсы над фатографамі, працы якіх, на думку пракурораў, таксама ўтрымлівалі элементы дзіцячай парнаграфіі.

Ёсць пытанне: ці можна лічыць злачынцамі спажыўцоў прадукцыі? Законы Нідэрландаў, Даніі і Швецыі дазваляюць мець падобныя матэрыялы, аднак забараняюць іх продаж. Трэба дадаць, што ў гэты годзе ў Злучаных Штатах выйшаў даклад аб уплыве спажывання дзіцячай парнаграфіі на свядомасць і паводзіны чалавека. Псіхолагі лічаць, што наяўнасць такога кшталту матэрыялаў не выклікае прамога стымулу чыніць акты фізічнага гвалту на адрас дзяцей або іншым спосабам парушаць мараль і закон. Аднак аўтары працы вызнаюць, што гэта толькі гіпотэза.

Вялікая праблема — у розных ацэнках феномену. Калі сыходзіць з літары закону, то грамадзяніну, якога падазраюць у такога кшталту злачынстве, дзяржава павінна гарантаваць справядлівы суд, які мае давесці яго віну, судзіць яго па канкрэтных артыкулах заканадаўства і адпусціць на волю пасля пакарання. У сваю чаргу, грамадства звычайна трактуе сувязь нейкай асобы з брудным бізнесам вельмі эмацыянальна, як індыкатар высокай ступені маральнага вычварэння асобы, якая не мае права на літасць. Можна ўзгадаць у якасці прыкладу пагромы ў Вялікабрытаніі, ахвярамі якіх былі людзі, якіх паліцыя проста падазравала ў кантактах з педафіламі. Нехта скраў у паліцыі іх базу дадзеных і выклаў у інтэрнэце.

Другі блок праблемаў — што рабіць? Натуральна, галоўную ролю ў пашырэнні такога кшталту матэрыялаў гуляе інтэрнэт. Увогуле, да канца 90-х, калі інтэрнэт пачаў свае пераможнае шэсце па свету, такая праблема нават не ўздымалася. Сёння галоўныя персанажы 20 працэнтаў парнаграфічных сайтаў у інтэрнэце — дзеці. Сітуацыя набыла яшчэ большую актуальнасць пасля таго, як у выніку тэхнічнай рэвалюцыі лічбавыя камеры сталі часткай побыту. Цяпер уладальнікам падпольных студый тэхнічна рабіць здымкі значна прасцей. Не будзем казаць пра тое, што інтэрнэт не мае межаў і дазваляе злачынцам парушаць закон адной краіны, знаходзячыся на тэрыторыі іншай.

Нельга сказаць, што паліцыя спіць. Яшчэ напрыканцы мінулага стагоддзя былі праведзеныя першыя аперацыі супраць уладальнікаў секс-парталаў у інтэрнэце, якія ўтрымлівалі забароненыя матэрыялы. Так, 1 верасня 1998 года брытанская паліцыя накрыла Wonderland Club — інтэрнацыянальную сетку педафілаў, якая дзейнічала ў інтэрнэце. У 12 краінах свету было арыштавана 107 чалавек.

Пра тое, што барацьба прыносіць вынікі, сведчыць статыстыка. Як паказвае досвед ЗША, кааперацыя паміж паліцыяй і фінансавымі інстытутамі дапамагае змагацца з набыццём дзіцячага порна ў сеціве з дапамогай крэдытных картак. Дзякуючы падобнаму закону ў Германіі колькасць злачынстваў у гэтай галіне ўдалося скараціць з 15 тысяч у 1999 годзе да 12 тысяч за апошні год.

Аднак праблема далёка не вырашаная. Больш за тое: эксперты баяцца, што наступствам цяперашняга крызісу будзе яшчэ большае пашырэнне рынку дзіцячай парнаграфіі. Як заявіла на Кангрэсе ў Бразіліі прадстаўніца ААН, ёсць падставы прагназаваць, што крызіс прывядзе да таго, што не адукаваныя, фізічна слабыя дзеці таксама будуць павінны дапамагаць выжываць бацькам. У гэтым плане ўдзельнікі Кангрэсу заклікалі ўрады, асабліва краін Трэцяга свету, не паніжаць стандарты сацыяльнай, медычнай аховы дзяцей, падтрымліваць адукацыйныя працэс.

Магчыма, справе дапаможа і незвычайная ініцыятыва папулярнай пошукавай сістэмы Google. Адміністрацыя Google разам з сацыяльнымі работнікамі спрабуе ідэнтыфікаваць дзяцей, здымкі якіх размешчаныя на парнаграфічных сайтах, каб прыйсці ім на дапамогу. Google таксама абяцае стварыць сістэму, якая зможа аўтаматычна аналізаваць усе здымкі і відэа парнаграфічнага характару ў інтэрнэце на прадмет іх адпаведнасці закону і маралі. Такіх здымкаў цяпер у сеціве не менш за 13 мільёнаў.

З'ЕЗД

# ЦАРЫЦЫН — СТАЛІНГРАД — ВАЛГАГРАД — СТАЛІНГРАД

Алег НОВІКАЎ

**Старшыня Камуністычнай партыі Расійскай Федэрацыі сярод галоўных задач партыі назваў перайменаванне гораду Валгаград у Сталінград.**



Рэзанансная фраза наконт таго, што Валгаграду патрэбна новая (старая) назва, была зроблена на з'ездзе КПРФ, які адбыўся ў Маскве 30 лістапада.

З'езд, дарэчы, выклікаў у грамадскасці павышаную цікавасць. Па-першае, камуністы, як ні круці, цяпер адзіная партыя ў Думе, якая не была створана пад патранатам Крамлю. Па-другое, на двары эканамічны крызіс, а, як сведчыць гісторыя, для партый з левай рыторыкай гэта самы зручны час.

Зюганаў сапраўды паводзіў сябе на з'ездзе вельмі ваяўніча. Заявіў, што вецер гісторыі зноў дуе ў ветразі ягонай партыі, што на двары рэвалюцыйная сітуацыя. Правадыр таксама сфармуляваў снежаньскія тэзісы — добраахвотнае аднаўленне СССР пры адэкватным прадстаўніцтве расійскага народу ў дзяржаўных і грамадскіх ведамствах, барацьба з русафобіяй, абарона расіян за мяжой і г. д. Сярод іншага, у выступе быў і пункт пра тапанімічную рэформу.

Нагадаем, што цяперашняе імя Валгаград носіць з 1961 года. Сталінградам ён стаў у 1925-м. Прычым сам Сталін не хацеў з'яўлення на карце горада з падобнай назвай. Ён дэманстратыўна праігнараваў пасяджэнне гарсавету, які галасаваў за перайменаванне Царыцына — арыгінальная назва гораду — у Сталінград. Лічыцца, што назва Царыцын паходзіць ад цюркскага «сары су» (жоўтая вада). Увогуле, горад спачатку хацелі назваць не Сталінград, а Ільіч або Мінінград (Мінін — тагачасны кіраўнік абласнога выканкаму).

Тым не менш, дзякуючы Сталінградскай бітве, якая пераламала ход другой сусветнай, назва Сталінград стала сімвалам перамогі. Дасюль на Захадзе можна сустрэць станцыі метро і вуліцы, якія носяць старую назву горада на Волзе.

Між тым, Мікіта Хрушчоў палічыў, што падобная геаграфічная назва — нонсенс у краіне, якая пазбаўляецца культу асобы. 1 лістапада 1961 года з Маўзалея вынеслі цела Сталіна, а праз дзесяць дзён рашэннем Вярхоўнага Савету СССР Сталінграду далі нейтральнае імя Валгаград. Трэба прызнаць, што рэформа выклікала незадавальненне нізоў. 77 працэнтаў сябраў гарсавету прагаласавалі супраць. На адрас кіраўніцтва СССР паступалі лісты ад рабочых калектываў з патрабаваннем пакінуць Сталінград Сталінградам. «Я не ведаю такога гораду», — пракаментаваў рашэнне аб перайменаванні маршал Жукаў.

Цікава, што для тых, каму тады было гадоў пад дваццаць, рэформа абсалютна нармальна ўкладалася ў рэвалюцыйны дух 60-х: палёт у космас Гагарына, палітычная адліга, міжнародны фестываль моладзі ў Маскве. Чаму б і горад не перайменаваць?

Падчас застою і перагляду курса Хрушчова мела месца спроба вяртання старой назвы. У 1984 годзе Крэмль у спецыяльным лісце прапанаваў мясцовым партыйным арганізацыям падумаць на гэты конт. Аднак хутка пачалася перабудова, і тэма на нейкі час страціла актуальнасць.

У посткамуністычнай Расіі КПРФ часта ўздымала пытанне наконт рэабілітацыі старой назвы гораду. Матывы камуністы зразумелыя: слова «Сталінград» мае асацыяцыю з вялікімі перамогамі часоў сацыялізму. Вяртанне старой назвы гораду магло б узмацніць у свядомасці жыхароў сімвалічную ідэнтыфікацыю з камуністамі.

Яшчэ ў 2001 годзе мясцовая фракцыя камуністаў дабілася прыняцця праекту аб перайменаванні гораду. Каб закон увайшоў у сілу, была патрэбная санкцыя Дзяржаўнай Думы. Аднак Дума ў 2003 годзе прагаласавала супраць. Парадаксальна, аднак праз год у рамках візіту ў Валгаград сам Пуцін выступіў за вяртанне гораду папярэдняй назвы. Магчыма, ён хацеў падняць свой прэстыж у вачах прысутных ветэранаў.

У мінулым годзе кампанія за перайменаванне пачалася зноў. У маі камуністы Піцера звярнуліся да гарсавету Валгараду з адпаведным заклікам. Цяпер вось свае слова дадаў Зюганаў.

Што далей? Нічога. Пры сучасных расійскіх парадках рэформа такога маштабу без згоды Крамля не рэальная. А нашто яе праводзіць? Зюганаў выбраў самы не зручны час.

Як піша адзін з расійскіх блогераў: «Даеш Сталінград! Таварыш Зюганаў, як сапраўдны ленінец, знайшоў чым заняцца падчас крызісу сусветнай эканомікі. Людзей звальняюць. Закрываюцца прадпрыемствы. І гэта лідэр партыі, якая «выйграла рэвалюцыю». Дзе, таварыш Зю, стачкі, народныя хваляванні, лозунгі «Эксплуатацыя эксплуататараў»? Няма падставы? Нізы не хочуць? Вярхі дакладна не жадаюць».

Лепшай ілюстрацыяй гатоўнасці людзей падтрымаць Зюганава з'яўляецца сацыялагічнае апытанне, якое правёў Цэнтр вывучэння грамадскай думкі (ВЦИОМ) у дні з'езду КПРФ. Амаль палова расіян (47 працэнтаў) лічаць, што левыя каштоўнасці ў краіне прадстаўляе «Адзіная Расія». Толькі 30 працэнтаў лічаць КПРФ левай партыяй. Сярод тых, хто адносіць сябе да ідэйных прыхільнікаў левых ідэй, за партыю Зюганава гатовы галасаваць толькі 29 працэнтаў.

Кампартыя разлічвае выкарыстаць крызіс для ўзмацнення сваіх пазіцый. Аднак прапанаваць нешта новае (у тым ліку лідэраў) не здольная. Да таго ж тыя, хто прапануюць сацыял-дэмакратычныя навацыі, як правіла, застаюцца па-за структурамі. Халасты стрэл Зюганава наконт Валгараду хутчэй стане імпульсам для той фракцыі расійскіх палітыкаў, якая выступае за вынас цела Леніна з Маўзалею.

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ

### ОСКАР ЛАФАНТЭН




Старшыня нямецкай «Партыі Левыя» заняўся стварэннем свайго інтэрнацыяналу. Усё пачалося ў 1999 годзе, калі канцлер ФРГ Герхард Шродэр адправіў яго за кейнсіянскія погляды ў адстаўку з пасады дырэктара Мінфіна. Лафантэн сышоў з пасады міністра ў аўтары самай жоўтай нямецкай газеты «Більд», аднак у душы захаваў надзею адпомсціць Герхарду. Час помсты надышоў год таму, калі наш герой узначаліў фронду супраць партыйнага кіраўніцтва і вывеў з сацыял-дэмакратычнай партыі левую фракцыю. Апошняя з'ядналася з былымі камуністамі ГДР. Так узнікла «Партыя Левыя», якая цяпер актыўна перацягвае на свой бок электарат сацыял-дэмакратаў. Больш за тое, партыя выходзіць на міжнародны ўзровень. У мінулыя выходныя ў Парыжы ў прысутнасці Лафантэна адбылася ўстаноўчая канферэнцыя французскага аналага партыі нямецкіх левых. Яе заснавальнікам стаў таксама былы сябра эсдэкаў. Мова пра былога сацыялістычнага сенатара Жан-Люка Міленхона. Міленхон чамусьці палічыў, што неабранне яго на пасаду старшыні Партыі сацыялістаў на мінулым тыдні ёсць фатальная здрада левай справе, і заснаваў свой праект. Праўда, на думку мясцовых аналітыкаў, перспектывы французскіх левых туманныя.

### ЧЭНЬ ШУЙБЯНЬ



Былы прэзідэнт Тайваня, старшыня Партыі прагрэсіўных дэмакратаў і галоўны апанент партыі «Гаміньдан» адстойвае пазіцыі прыхільнікаў незалежнасці востраву ад Кітайскай Народнай Рэспублікі і нават патрабуе, каб у канстытуцыі было напісана, што жыхары Тайваню не кітайцы, а асобная нацыя. Прагрэсіўныя дэмакраты таксама сцвярджаюць, што сябры «Гаміньдану» — іншаземцы, якія прыехалі на востраў падчас эвакуацыі войскаў Чан Кайшы з кантынентальнага Кітаю. У любым выпадку, нечакана для ўсіх Чэнь Шуйбянь, які яшчэ сем месяцаў таму быў прэзідэнтам, апынуўся ў турме. Афіцыйна яго засадзілі за крадзеж з казны. Сам Чэнь Шуйбянь кажа, што яму былі патрэбныя грошы, каб праводзіць сакрэтныя аперацыі знешняй разведкі. Ён таксама заявіў, што яго арышт — справа рук агентаў Пекіну, якія мараць пра інкарпарацыю Тайваня ў склад КНР. Цяперашнія ўлады Тайваня — партыя «Гаміньдан» — сцвярджаюць, што словы Чэнь Шуйбяня — лухта. Папярэдняга прэзідэнта Тайваня таксам адправілі ў турму за карупцыю. У любым выпадку, калі план далучэння Тайваня да КНР існуе, рэалізаваць яго будзе цяжка. Некалькі месяцаў таму апазіцыя вывела на вуліцы паўмільёна чалавек, якія ладзілі маніфестацыі ў абарону незалежнасці востраваў.

### ЛЕЎ СІЛЕНКА



На мінулым тыдні памёр маг, заснавальнік вучэння «Украінская нацыянальная вера», галоўны паганец Украіны. Ён нарадзіўся ў 1921 годзе. У 1941-м пайшоў на фронт і трапіў у палон. Падчас нямецкай акупацыі працаваў журналістам. Кажуць, што ў гэты час ён меў кантакты з акультыстамі — кадравымі супрацоўнікамі СС. Так ці інакш, пасля вайны ён перабраўся ў Канаду, дзе ў 1966-м заснаваў паганскую секту «Родная ўкраінская нацыянальная вера» (РУНВіра). Адпаведна ягонай канцэпцыі, украінцы — гэта паганцы, якія маюць пакланяцца Дажбогу. Князь Уладзімір, які ўвёў хрысціянскую веру на Русі, быццам ёсць здраднік народу. Увогуле, якраз украінцаў ён лічыць арыямі, якія з берагоў Дняпра прыйшлі ў Індыю. Напачатку групоўка мага аб'ядноўвала выключна ўкраінскіх эмігрантаў у Злучаных Штатах. Так, сярод прыхільнікаў РУНВіры быў бацька цяперашняй жонкі прэзідэнта Украіны Юшчанкі, якая нарадзілася і вырасла ў ЗША. Спачатку 90-х секцыі РУНВіры пачалі ўзнікаць ва Украіне. Зараз іх прыблізна сорак, хаця нейкага ўплыву на грамадска-палітычнае жыццё арганізацыя не мае. На пачатку гэтага года на радзіму вярнуўся і сам заснавальнік руху, якому жыць, аднак, заставалася нядоўга. Дарэчы, прыхільнікі РУНВіры вядуць пачатак злічэння часу ад Мезінскай археалагічнай культуры, памяткі якой знойдзеныя ў Чарнігаўскай вобласці, што недалёка ад Беларусі.

▸ ТАЯМНІЦЫ ГІСТОРЫІ

# СІМВАЛЫ ПРЫМІРЭННЯ

Аляксей ХАДЫКА

**На цырымоніі ў гонар 196-й гадавіны пераправы арміі Напалеона цераз Бярэзіну 23 лістапада 2008 года пасол Францыі ў Беларусі Мірэй Мюсо сказала: «У XXI стагоддзі слова «Бярэзіна» павінна стаць сімвалам прымірэння і сяброўства». Яна паведаміла, што ў 2012 годзе, да 200-годдзя пераправы арміі Напалеона цераз Бярэзіну, у Барысаўскім раёне пры дапамозе беларускіх і французскіх гісторыкаў, а таксама Міністэрства абароны Беларусі плануецца адкрыць культурна-гістарычны цэнтр. Апрача таго, на наступным тыдні ў беларускія кнігарні паступіць у продаж кніга французскага пісьменніка Патрыка Рамбо «Ішоў снег» пра вайну 1812 года.**







У выступе на Брылёўскім полі ля сціплага манумента, адноўленага ў 1992 годзе (усталяваны ў 1912-м, разбураны ў 1920-м), пасол узгадала, што з 500 тысяч салдат арміі Напалеона дамоў рознымі шляхамі вярнуліся не больш за 50 тысяч, а пераправа цераз Бярэзіну стала «агульным крывавым мінулым, пра якое трэба памятаць… Маладое пакаленне мусіць ведаць, што свет крохкі і бясцэнны. Еўрапейскі кантынент павінен быць гаванню дружбы і цярпімасці».

Але падзяка мясцовым органам і жыхарам вёскі Студзёнка побач з месцам пераправы французаў за «ахову вечнага спакою ўчарашніх ворагаў» гучала неяк неперакана́учча. Ці занадта дыпламатычна. Бо колькі магілаў і помнікаў учорашніх ворагаў стаіць — і ахоўваецца — на беларускай зямлі. І хто тады быў большым ворагам для жыхароў нашай краіны? Вайна 1812 года ніяк не была для нашых продкаў «Айчыннай» — Айчыны яны пазбавіліся ў апошнія дзесяцігоддзі XVIII стагоддзя. І напачатку Напалеона віталі як вызваліцеля ад расійскага прыгону ўсе станы грамадства. Ніхто не супраць прымірэння ў XXI стагоддзі, але ці варта забывацца, як усё адбывалася?

## У расійскім палоне

Патрапіўшы ў расійскі палон пасля падзелаў Рэчы Паспалітай, беларусы не толькі страцілі дзяржаву. Яны шмат што набылі: выключна жорсткую эксплуатацыю і прыгон сялян, руйнаванне адной з самых развітых у Еўропе юрыдычных сістэм, каланіяльнае рабаванне падаткам, што збіраўся срэбнай манетай і перавышаў агульнарасійскі падатак асігнацыямі ў 5 разоў (!). Ён быў адменены толькі ў 1811 годзе, калі Аляксандр I нарэшце зразумеў небяспеку агульнага азлаблення беларусаў напярэдадні ўжо немінучай вайны з Напалеонам. Дадайце рэлігійны ціск — асаблівa на грэка-каталікоў і беларускіх праваслаўных (старыя праваслаўныя манастыры зачыняліся, навязваліся структуры рускай праваслаўнай царквы). Ды яшчэ агульнае падпарадкаванне структурам варожай дзяржавы з заўважна ніжэйшым культурным узроўнем. Вы не чулі пра гэта ў савецкай школы? Тады трошкі статыстыкі — хоць бы толькі з галіны адукацыі.

У 1808 годзе ў Маскоўскай і Пецярбургскай навучальных акругах (15 губерній) у гімназіях навучаўся 741 вучань, у Віленскай (8 губерняў) — 1305. У 1824-м адпаведна — 19692 і 22720. Цікавая тэндэнцыя «культурнага ўздыму»? Ці выроўнівання культур? Дарэчы, лічба ў 1000 студэнтаў, якая была дасягнута Віленскім універсітэтам (заснаваным у 1578 годзе) у 1828-м, аказалася пад сілу Маскоўскаму (заснаванаму ў 1755) толькі ў 1855 годзе. Не забудзем, праўда, што браты з ухода да гэтага часу і Віленскі, і Полацкі універсітэты зачынілі. Бо адукаваны непрыяцель — страшны. Але ўсё роўна, нават і па перапісе 1898 года, узровень пісьменнасці «беларускіх губерняў» быў удвая вышэйшы за расійскія.

## «Слава вызваленцу!»

Як жа сустрэлі французскага імператара Напалеона I Банапарта на пачатку вайны, якая была абвешчана 22 чэрвеня 1812 года па еўрапейскім і беларускім грыгарыянскім стылі, або 10 чэрвеня 1812 года па старым юліянскім расійскім? Рушыўшы ў паход праз 2 дні, ужо 28 чэрвеня пад воклічы «Слава вызваліцелю!» армія Напалеона ўваходзіла ў сталіцу, Вільню. На чале войска пад бел-чырвона-белымі сцягамі ішоў уланскі полк князя Дамініка Радзівіла, патрыёта-рамантыка. Ён узброіў жаўнераў за свой кошт і далучыўся да Вялікай арміі. Войска Напалеона налічвала на той момант да 450 тысяч жаўнераў супраць 213 тысяч 1-й, 2-й і 3-й расійскіх армій Барклая дэ Толі, Баграціёна і Тармасава на напрамку галоўнага ўдару. Цалкам расійскае войска, пры перавазе артылерыі — у 1600 на 1370 гармат — таксама было большым (да 975 тысяч).

Але справа не ў статыстыцы і не ў хадзе баявых дзеянняў, якія больш-менш дакладна выкладаліся і ў савецкіх даведніках. Засяродзімся на атмасферы вайны, чаканні бакоў і розных груповак беларускай шляхты і простага люду, на пераменах настрояў і памылках Напалеона, якія сталі фатальнымі не толькі для яго, але і для беларускага краю. І пастараемся зрабіць гэта праз творы мастацтва, далёкія ад афіцыёзнай замовы.

## План сенатара Агінскага

Мала хто памятае палатно 1810 года жывапісца Юзафа Пешкі (1767–1831), ураджэнца Кракава, які ў 1793–1812 гадах жыў у Вільні, Пецярбургу, Маскве, Гродна, Мінску, бываў у Нясвіжы, Смілавічах, Дукоры. У 1810 годзе ён выканаў карціну «Алегарычная сцэна з Напалеонам» (захоўваецца ў Варшаве, у Нацыянальным музеі). Імператар паказаны на кані, а перад ім дзве жаночыя постаці — Польшча і Літва — чакаюць вызвалення. Ужо тады, у 1810 годзе, адукаваныя і разумныя людзі былой Рэчы Паспалітай пачалі звязваць з Францыяй надзеі на гістарычныя перамены ў жыцці сваёй зруйнаванай Айчыны. І не выпадкова — Напалеон адмовіўся ратыфікаваць падпісаную 4 студзеня 1810 года ў Пецярбурзе канвенцыю, якая мелася, у кантэксце вымушанага знаходжання Расіі ў фарватэры французскай палітыкі, гарантаваць Аляксандру I хоць бы немагчымасць аднаўлення Польскага каралеўства ці Рэчы Паспалітай.

На пачатку лютага 1810 года Расія занялася падрыхтоўкай да вайны. Разгарнулася таксама гандлёвая вайна з узаемным падвышэннем тарыфаў. З канца 1810 года Аляксандр I выношваў планы ліквідацыі фармальна незалежнага Варшаўскага герцагства і захопу польскіх земляў шляхам абвяшчэння сябе польскім каралём. Рашучае пярэчанне гэтаму з боку ваеннага міністра герцагства Юзафа Панятоўскага высунула наперад у 1811 года план сенатара, беларускага князя Міхала Казіміра Агінскага — стварыць Вялікае княства Літоўскае ў складзе Расіі, каб праз яго аднавіць Польскае каралеўства… але абавязкова ў форме уніі з Расіяй. Нагадвае 1939–1945-я гады ў нашым рэгіёне, ці не так? Агінскі пасля сустрэч з Напалеонам I у 1807–1810 гадах зразумеў, што той не выказвае відавочнай зацікаўленасці да адраджэння Рэчы Паспалітай, і пайшоў на кантакты з расійскім царом, спадзеючыся сваім праектам хоць мінімальна адрадзіць адміністрацыйна-прававую самастойнасць Радзімы. А таксама аднавіць тут справаводства па Статуце 1588 года, свой суд, сваю адукацыю, і цягам 10 год вызваліць з прыгону сялян. І нават утварыць асобнае Літоўскае войска ў складзе расійскай арміі.

Але на пачатку 1812-га план быў пахаваны Аляксандрам I. Адпаведна, большы розгалас і папулярнасць сярод шляхецкіх, мяшчанскіх, інтэлігенцкіх колаў набыла пазіцыя групоўкі ў складзе іншых магнатаў — Л. М. Паца, А. Сапегі і згаданага вышэй Д. Радзівіла, якія спадзяваліся на аднаўленне незалежнасці краю праз саюз з Францыяй і Варшаўскім герцагствам.

## «І нам — з Напалеонам!»

Таму прыход Напалеона, які 1 ліпеня абвясціў пра стварэнне Часовага ўраду ВКЛ, вітаўся адназначна — як вызваліцеля. Нават у жніўні 1812 года, калі 16–17 жніўня адбылася першая генеральная бітва пад Смаленскам і пачалі нарастаць складанасці з забеспячэннем Вялікай арміі правіянтам, большасць жыхароў ВКЛ захоплена падтрымлівала Напалеона. 15 жніўня ўся Еўропа святкавала 43 год нараджэння імператара — па гарадах і мястэчках ВКЛ ішлі святочныя імшы, банкеты, феерверкі, балі.

Усё ішло так, як запісана Адамам Міцкевічам:

*«Хапае моладзь зброю —*
*стрэльбы і ягдташы,*
*А маткі паўтараюць чутае*
*з амбона:*
*«З Напалеонам Бог, і нам —*
*з Напалеонам!»*

Святкуе Ліда, на касцёлах транспаранты: «Вялікі цэзар! Жыві, атрымаўшы ў дар ад нараджэння шчасце даваць правы і поспехі». Урачыстыя імшы, абед у доме падпрэфекта, салюты, на галоўнай Віленскай (зараз Савецкай) вуліцы ўсталявана трыумфальная піраміда з факеламі і віншаннямі. Сярод іх такое: «Найяснейшаму, Наймагутнейшаму, Непераможнаму Герою Цэсару і Каралю Напалеону Вялікаму ад зямлі мужных ліцвінаў, якая атрымала свабоду, дзякуючы ягоным намаганням. Вызваліцелю свайму, дня 15 жніўня 1812 года».

Або такое:

*«Каліські чужой крывею*
*цякла Лідзея,*
*Сёння з ёй змешваюцца*
*Нёман, Днепр, Дзвіна*
*Мацнее нашай Пагоні надзея,*
*Ужо нашага цярпення*
*прайшла гадзіна».*

Святкуюць таксама Вільня, Навагрудак, Гродна, Ваўкавыск, дзесяткі гарадоў і мястэчак…

## Беразіна

Але ўжо падпісваецца ўказ Напалеона пра рэквізіцыі з губерняў ВКЛ 528 тысяч тон збожжа, 100 тысяч тон аўса, 53 тысячы кароў. Некаторыя сяляне, зрабаваныя да ніткі, пачынаюць брацца за сякеры. А Напалеон, змяніўшы пачатковыя планы скончыць кампанію 1812 года ў Мінску і Смаленску, а самому застацца ў галоўнай кватэры ў Вільні і «заняцца ўпарадкаваннем

Літвы... бо рухацца сёлета далей — гэта ісці насустрач сваёй пагібелі» — фатальна крочыць з арміяй да Масквы. А за права канчатковага аднаўлення Польшчы ў саюзе з ВКЛ (да чаго імкнецца і створаны ім Часовы ўрад ВКЛ на чале з С. Солтанам) — патрабуе шырокага нацыянальнага руху, у тым ліку ў сваю падтрымку.

Далей былі Барадзіно, узяцце і пажар Масквы, няўдалы Тарутінскі бой французскага авангарда 18 кастрычніка і праследаванне Напалеонам Кутузава да Малаяраслаўца (бой 24 кастрычніка) — быццам без няўдач, але з паступовым салабеннем і скарачэннем войска ўжо да 70 тысяч баяздольных жаўнераў. І тады ўжо фактычна ўцёкі на Смаленск са зруйнаванай краіны, дзе папросту не застаецца ўжо ежы. А 4 лістапада надыходзяць нефранцузскія маразы. Каля Барысава, ля Студзёнкі і Весялова, 26 лістапада 70-тысячная армія Напалеона (у якой дзеяздольных на той момант толькі 30 тысяч штыкоў) пачала 3-дзённую пераправу праз Бярэзіну. Яна ішла пад напорам рускіх — арміі Чычагова (35 тысяч) і корпуса Вітгенштэйна (40 тысяч) падышлі з абодвух бакоў ракі на наступны дзень. Французы ўпарта трымалі плацдармы па берагах Бярэзіны, але калі 29 лістапада з раніцы яны вымушана спалілі пантоны, з Напалеонам да Вільні рушылі рэгулярным строем ужо толькі 9 тысяч жаўнераў. Фантастычная па драматызму пераправа, якую мы бачым на палатне беларускага мастака-баталіста Януарыя Сухадольскага (1797–1875), напісаным ужо ў 1866 годзе, сталася фактычным завяршэннем расійскай кампаніі Напалеона. Тое, што непасрэдна назіраў ужо ў Вільні 10 снежня славуты пазней мінскі мастак Ян Дамель (1780–1840), і адлюстраваў не без спачування ў кампазіцыі «Адступленне французаў праз Вільню ў 1812 г.» (твор 1820-х), — рэшткі напалеонаўскай гвардыі. Толькі 4 тысячы чалавек. Сам імператар, даручыўшы камандаванне Мюрату, раней, 5 снежня, ад Смаргоні накіраваўся напрасткі ў Парыж.

### Пасля Беразіны

Многія беларускія прыхільнікі засталіся вернымі яму і да канца біліся ў яго войску. Князь Дамінік Радзівіл, асабіста высока ацэнены як адважны кавалерыст Напалеонам і Мюратам, са сваімі уланамі ў 1813 годзе ўдзельнічаў у бітвах французскай арміі пад Лютцэнам, Дрэздэнам, Лейпцыгам. А загінуў у сутычцы пад Ганаў 30 кастрычніка 1813 года. На ім скончылася легальная старэйшая лінія роду Радзівілаў — уладальнікаў і ардынатаў Нясвіжа, бо ягоны адзіны сын Аляксандр Дамінік нарадзіўся да заключэння бацькамі афіцыйнага шлюбу.

А Беларусь страціла спачатку Полацкі, а потым, пасля чарговага няўдалага вызвольнага паўстання 1830–1831 гадоў, Віленскі універсітэт. Потым грэка-каталіцкую рэлігію (1839), потым ва многіх гарадах — сімвалы сваёй свабоды, ратушы, потым... Але гэта ўсё ўжо даволі добра вядома — бо свабоды мы канчаткова не страцілі — і вярнулі яе ў 1991 годзе. Вернуцца і адукацыя, і свой строй, і свая культура, за якія змагаліся тыя, хто спадзяваўся ўбачыць у Напалеоне вызваліцеля.

Нарэшце, яшчэ адзін кароткі і трагічны сюжэт — лёс выбітнага мінскага мастака Валентыя Ваньковіча (1800–1842). Ці не найлепшы беларускі мастак свайго часу, аўтар партрэтаў Адама Міцкевіча і Аляксандра Пушкіна, па ўзросце не мог ваяваць за свабоду Радзімы ў 1812 годзе. Але збіраўся зрабіць гэта ў паўстанні 1830–1831 гадоў, набыўшы каня і вайсковы рыштунак. Не дазволіла слабое здароў'е. Пад уражаннем паразы паўстанцаў у 1834 годзе, ён піша драматычна-напружаную кампазіцыю «Напалеон ля вогнішча». А канчаткова пакінуўшы Радзіму і перабраўшыся да А. Міцкевіча ў Парыж, дзе ён пахаваны на могілках Манмартр-дэ-Сэн-Дэні, яшчэ раз звяртаецца да гісторыі французскага імператара. Паўстае карціна «Трыумф Напалеона». Як не дзіўна, нават у 1840-я сярод беларуска-польскай эміграцыі заставаўся папулярным вобраз вялікага карсіканца, дзейнасць якога ў містычным плане асэнсоўвалася як Боскае наканаванне. Напалеон Ваньковіча — пакутнік, няздзейснены выратавальнік Еўропы, і найперш уласнай Айчыны мастака з расійскай няволі — крыжак XIX стагоддзя.

***

Выбачэнні амбасадаркі Францыі спадарыні Мірэй Мюсо за «варожасць» напалеонаўскай арміі выглядаюць не зусім абавязковымі. Як не зусім абавязковымі глядзяцца і паказ французскіх фільмаў пра Напалеона ў Мінску, і прэзентацыя рамана Патрыка Рамбо «Ішоў снег» пра кампанію 1812 года (выдавецтва «Макбел»)... чамусьці па-руску. Як быццам бы, саступіўшы ВКЛ, цень Напалеона аддае яго зноў ценю Аляксандра І. Гэта памылка. Хаця гэту памылку правакуюць нашы айчынныя культуртрэгеры, спадчыннікі дасыланага нам цягам двух стагоддзяў з усходу каланіяльнага чынавенства.

ГАДАВІНА

# ВАНДА Ў КУПАЛІХІ

Уладзімір СОДАЛЬ

**Язэп Лёсік, знакаміты мовазнаўца, вучоны, грамадскі і дзяржаўны дзеяч, нашанівец, нарадзіўся 18 лістапада 1883 года. Сёлета споўнілася 125 гадоў ад яго нараджэння. У 1930 годзе, якраз незадоўга перад днём сваіх народзінаў, Язэп Лёсік быў арыштаваны, абвінавачаны разам з іншымі ў стварэнні Саюза вызвалення Беларусі.**



Язэп Лёсік.



**Крывенка Анатоль Змітравіч, 1942, Мінск. Лявіцкая (па мужу Лёсік) Ванда Антонаўна (1895–1969) — беларуская пісьменніца. Дачка беларускага пісьменніка Ядвігіна Ш. з 1933 г. дзяліла ссылку з мужам Язэпам Лёсікам. Аўтар успамінаў пра бацьку.**

Улетку 1959 года Мінск наведала дачка Ядвігіна Ш. Ванда Лявіцкая. Яна ж — жонка Язэпа Лёсіка, сучасніца Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Алаізы Пашкевіч Цёткі, Канстанцыі Буйлы, Алеся Гаруна, сваячка Міцкевічаў — Якуба Коласа. Колькі яна ведала пра ўсіх іх, пра вытокі нашага нацыянальнага адраджэння! Прыехала яна ў места свайго юнацтва з расійскага Ліпецку, куды патрапіла з Беларусі не па сваёй, вядома ж, волі. Прыехала, каб дамагчыся рэабілітацыі мужа хаця б праз 30 год.

Здавалася, яе прыезд станецца сенсацыяй для даследчыкаў, рэпарцёраў, ад іх не будзе адбою. Налучылася зручная нагода чарпануць новых, невядомых дагэтуль звестак пра наша культурнае і нацыянальнае жыццё на пачатку XX стагоддзя. І не менш цікавыя звесткі пра дваццатыя і трыццатыя гады. Ды дзе там: не толькі ніхто не сустрэўся з дачкой слыннага пісьменніка і жокай не менш слыннага Лёсіка. Ніводная газета нават слоўцам не адгукнулася пра згаданую падзею. А між тым Ванда Лявіцкая-Лёсік і сама актыўна шчыравала на адраджэнне Беларусі: першая беларуская кнігарка ў Мінску, адна з першых беларускіх выхаванцаў беларускага прытулку, адна з першых настаўніц першай беларускай школы ў Мінску. Удзельніца і сведка шмат якіх лёсавызначальных у жыцці Беларусі падзей.

Цётцы Вандзе было што расказаць, але не было каму паслухаць. А мо і было, ды не далі. Абставіны, страх, злыя людзі. Хапун, рэпрэсіі. Нам, каму ў 1959 годзе было вакол дваццаці, пра беларускае адраджэнне і яго герояў ніхто не распавядаў. Але ж сучаснікі Ванды! Яны ж то ведалі, хто такія Ванда Лявіцкая, Язэп Лёсік, Ядвігін Ш. Тым не менш не варухнуліся, каб прывецілць дачку слыннага пісьменніка, запісаць яе ўспаміны, пагутарыць з ёй.

Ад Ванды, паводле яе слоў, усе шарахаліся. Адна толькі Уладзіслава Францаўна, Купаліха, ды яшчэ колькі даўніх беспасадных знаёмых па людску прывецілі Ванду. Мой расповед — рэстаўрацыя яе сустрэчы з Уладзіславай Францаўнай, жонкаю Янкі Купалы.

Прывёз Ванду Лявіцкую да Уладзіславы Францаўны Кастусь Самахвал, даўні прыяцель Лёсікавай сям'і. Папярэдне пра прыезд дамовіліся па тэлефоне. Жыла тады Уладзіслава Францаўна на Омскім завулку, 7, у двухпавярховым будынку, які ўрад Беларусі збудаваў для Купалавай сям'і. Кастусь Самахвал быў тады пры пасадзе, меў службовую машыну і мог Ванду Антонаўну звазіць, куды яна толькі пажадала б. А найперш яна пажадала сустрэцца з Уладзіславай Францаўнай.

«Калі мы прыехалі, — згадвае Кастусь Самахвал, — ва Уладзіславы Францаўны было шумна і людна... Якіясь дзяўчаты, кабеты... Гамана, шум... Але як толькі прыехала Ванда Антонаўна, шум гэты аціх, усе неяк неўпрыкмет рассеяліся, і яны засталіся толькі ўдзвюх. Першая, як гаспадыня, загаварыла Уладзіслава Францаўна.

— Вандачка! Якая ты стала? Ой, колькі ж гэта мы з табою не бачыліся? Колькі ўсяго перажыта! Ужо даўно няма майго Яначкі — паспяшалася Уладзіслава Францаўна сказаць-паведаміць пра самы свой пякучы боль. — Асірацела я... Цяпер во музей будую яму...

Яны моцна пажагналіся. Уладзіслава Францаўна пераявяла дых, расказаўшы даўняй сяброўцы пра сваё самае вялікае гора, ды пачала распытваць госцю пра яе трывогі і клопаты:

— Ну а што ў цябе? Што з Язэпам?

— І Язэпа даўно няма, — з цяжкім уздыхам мовіла Ванда. — Звялі яго са свету нелюдзі... Колькі я за яго паперажывала, вытрывала. Колькі слёз выплакала... Сэрца адбалела... Усім нам долю пакалечылі... От я і прыехала... Можа мне ўдасца хоць абяліць яго... Калі ўжо не самога, то хоць ягонае светлае імя вярнуць, рэабілітаваць... Можа ты мне, Уладачка, нараіш хоць што... Да каго схадзіць, з кім параіцца...

— А як жа, а як жа! — заспяшалася Уладзіслава Францаўна. — Што змагу — дапамагу. Ты толькі мне раскажы ўсё. Мы ж тут нічога і ні пра каго толкам не ведаем...

Прыяцелькі зручна ўладзіліся на канапе і, не зводзячы адна з адной вачэй, слухалі адна адну, гаманілі. Ванда найперш распавяла сумна горкую гісторыю, як замэнчылі яе Язэпа.

— А як жа дзеці? — пацікавілася Уладзіслава Францаўна.

— Дзеці даўно выраслі. Юрка недалёка ад мяне — у Армавіры. Пры высокай пасадзе. Галоўны энергетык краю. Але нудзіцца па Беларусі. Хочацца яму тут жыць і працаваць. А яго ў партыю гукаюць. А мы не ведаем, што і рабіць.

— Я памятаю Юрку. Вельмі здольны быў хлопчык. Яго з малых гадоў цягнула да электрыкі.

І тут Уладзіслава Францаўна прызналася:

— І мяне ж, Вандачка, уцягваюць у тую партыю...

У Ванды ад нечаканасці аж вочы на лоб палезлі: «Уладка ў партыі! Якая з яе партыйка? Навошта ёй, сталай, гэтая партыя?»

— І ты што? — спалохана спыталася яна.

— Музей будуецца... Музей трэба дабудоўваць, — адказала дыпламатычна Уладзіслава Францаўна і расказала сваёй даўняй прыяцельцы, што ўжо хто-ніхто квапіцца на гэты будынак, хоча забраць яго пад музей Леніна. — Але гэтага я ніколі не дапушчу, — рашуча дадала Купаліха.

Ванда ведала Уладку няблага. Але такой рашучай бачыла яе першы раз. Паспрабавала супакоіць прыяцельку, суцешыць, што да гэтага не дойдзе: знойдзецца хтось разумнейшы за гэтых пранырaў, якія наважыліся будынак для Купалавага музея заняць музеем Леніна. І ўсё будзе так, як хоча Уладка, як яно павінна быць.

— Ну але што мы пра гэтую партыю, — спахапілася Уладзіслава Францаўна. — Расказвай далей пра дзяцей. Дзе Люцыя? Дзе Алеся? Яны ж ўсе нашы хрэснікі...

І Ванда распавяла пра сваіх дачок: Люцыя жыве ў Ліпецку, Алеся — у Татарцы на Стаўрапольшчыне. Абедзве настаўнічаюць. Сама Ванда жыве пры Люцыі. Мае ўжо і ўнучак. Усе яны там — у Расіі! Не забылася Уладка спытацца і пра Вандзіну матулю: як склалася яе доля. І зноў пачула сумную гісторыю.

Луцыя Лявіцкая памерла ў 1945 годзе ў Нежыне — у вялікай нястачы. Не было нават з чаго труну зляпіць.

А пасля пачалі згадваць нашаніўцаў, хто з іх выжыў, ацалеў. Згадалі Паўліну Мядзёлку, Янку Журбу, Костку Буйлу... Іх успамінам не было канца. Ванда таксама шмат пра што распытвала. Прынамсі, пацікавілася, ці выходзіць у Вільні хоць якая беларуская газета ці часопіс. І вельмі здзівілася, калі пачула, што ў Вільні ўсялякае беларускае жыццё спынена. Ёй гэта было незразумела. Як гэта — каб у Вільні, дзе ў гады іхняга юнацтва віравала беларускае жыццё, раптам усё змерла. Такое не бывае, такое не павінна адбывацца... І тут жа згадала долю свайго Язэпа і такіх, як ён. Ёй зашчымела сэрца, і яна заспяшалася дадому, да Самахвалаў, хоць і збіралася заначаваць ва Уладкі, у ейнай утульнай кватэры на Омскім завулку, 7. Зразумела, што калі яшчэ даўжэй пабудзе, сэрца не вытрымае. Нават адмовілася з'ездзіць у Карпілаўку. І довад адзін і той жа: «Сэрца не вытрымае, лопне!» Прапанавалі ёй звазіць яе ў Вільню. Але і ад гэтай прапановы яна адмовілася. «Пачакайце, — сказала яна. — Паглядзім, як у мяне ўсё ў Мінску складзецца з тым, дзеля чаго і прыехала. Тады можна будзе і пра Вільню пагаварыць...»

Ёй трэба было ў самым блізкім часе напаткацца з пракурорам рэспублікі, і такую сустрэчу ёй паабяцала наладзіць усё ж тая Уладзіслава Францаўна. Гэтага дня і пачала чакаць Ванда. І дачакалася. Неўзабаве пасля яе прыезду ў Мінск Лёсіка рэабілітавалі. Гэта вялікая радасць усіх Лёсікаў. Яна была ўспрынятая як уваскрэсенне дарагога ім чалавека.

▸ ВЫСТАВЫ



# СВЕТ ШКЛА

**Нацыянальны мастацкі музей з 3 снежня па 10 студзеня, на крышталёвыя калядныя тыдні, прэзентуе адпаведную выставу, прысвечаную 125-годдзю славутага завода «Нёман».**

Здаецца, агульнадаступнае шкло, а між тым каляровыя і празрыстыя вазы для кветак, кубкі, побытавыя шкляныя прыстасаванні кшталту прылад для выціскання цытрынавага соку, якія можна спаткаць у дамах нашчадкаў беларускіх мяшчан і шляхты, што жылі ў першыя дзесяцігоддзі існавання нёманскай вытворчасці, — ужо помнікі калі не мастацтва, дык гісторыі беларускай культуры. Наведайце выставу — і пашукайце ў сябе дома!

Экспазіцыя прапануе каля 300 твораў з калекцыі музея, а таксама з мастацкай лабараторыі завода і прыватных збораў. Пачынаўся «Нёман» з невялікай вытворчасці шкла і шклянога посуду на лясной дачы землеўласніка Зянона Ленскага побач з Бярозаўкай Лідскага уезду Віленскай губерні ў 1883 годзе. Праз дзесяцігоддзе інжынер Вільгельм Краеўскі і дэкаратар шкла Юліус Столле зрабіліся арандарамі, а пазней уласнікамі завода. Хутка паўстала шкляная фірма «Нёман», што выйшла на сусветныя рынкі. Юліус Столле, зрабіўшыся аднаасобным уласнікам прадпрыемства, у 20–30-х гадах мінулага стагоддзя прывёў яго да росквіту: прадукцыя прадавалася па ўсёй Еўропе, а потым трапіла ў ЗША і Канаду. Цяжка паверыць, што фабрыка, з якой супрацоўнічалі спецыялісты з Чэхіі, Германіі, Польшчы, Бельгіі, вырабляла да 10 тысяч гатункаў посуду з бясколернага і каляровага шкла з разнастайным дэкорам.

Але надышоў 1939 год — нацыяналізацыя завода, а потым сусветная вайна і разбурэнне ў друз.

З 1944 года завод працаваў па захаваных даваенных формах, а бліжэй да 1958 года, калі на выставы «Экспа–58» у Брусэлі туалетны прыбор Галіны Ісаевіч «Аметыст» заваяваў бронзавы медаль, на вытворчасці склалася школа адораных, творча індывідуальных майстроў. Па драбніцы аднаўляўся ўзровень майстэрства — у Ленінградзе вучыліся Уладзімір Мурахвер, Людміла Мягкова, Валянціна Дзвінская, з Эстоніі прыехалі Сільвія Раудвеэ і Керсці Вакс. У 70–80-я гады сваіх выпускнікоў на завод прапанаваў Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут: гэта былі Таццяна Малышава, Вольга Сазыкіна, Галіна Сідарэвіч, Васіль Самахвалаў.

Як вынік, сярод прадстаўленых на выставе работ — непаўторныя аўтарскія творы, якія выконваліся ў заводскіх умовах «Нёмана». Сярод тэндэнцый новага этапу вызначаўся зварот да фактуры гладкага шкла, тонкая эстэтызацыя якога не дае больш успрымаць яго як паўфабрыкат. Ішло адраджэнне традыцый выкарыстання выразнасці задымленага шкла і тэхнікі ручной прасоўкі, уласцівай «Нёману» пачатку XX стагоддзя. Была адноўлена забытая тэхніка дэкаравання «кракле», удасканалена алмазная агранка крышталю, выкарыстоўваўся дэкор адбіткаў на шкле натуральных фактур. І нарэшце — як не прыгадаць знакамітую нёманскую «венецыянскую» нітку, стваральнік якой Анатоль Фёдараў на міжнароднай выставе 1973 года за кампазіцыю «Кветка» атрымаў Гран-пры.



# ГАЛЕРЭЯ BON JOUR

**Палац Мастацтваў не стамляецца прапаноўваць новыя праекты. Гэтым разам на другім паверсе стартуе новая «галерэя ў музеі» — Bon Jour.**

І адразу абяцаныя выставы могуць зрабіцца вельмі прыцягальнымі для гледачоў. Відавочна, паказы будуць досыць камернымі (калісці раней выставы на гэтым месцы ўжо практыкаваліся), але затое камернасць прасторы вылучае індывідуальнасць майстра. Бо нават выдатнага мастака вялізныя плошчы асноўных залаў Палаца часам «праглынаюць і нівелююць». З 6 па 17 снежня будуць экспанавацца каларыстычна тонкія і лірычныя палотны Сяргея Цімохава. З 18 па 28 снежня — працы Зміцера Маслія, якія хочацца назваць інтэлектуальна-пластычнымі рэбусамі з прысмакам пачуццёвай правакацыі.



# ВЯРТАННЕ МАЙСТРА

**У галерэі Універсітэта культуры на Кастрычніцкай плошчы ў цокалі Палаца Рэспублікі з 20 лістапада адбываецца вяртанне з забыцця выдатнага беларускага графіка першай паловы XIX стагоддзя Казіміра Бахматовіча (1808–1837), вучня Яна Рустэма па Віленскім універсітэце і ўраджэнца Дабраўлян на Смаргоншчыне.**

Выстава так і завецца: «Успамін пра Дабраўляны». Творы на выставе — гэта пераасэнсаваныя і пераўвасобленыя ўражанні ад уласных твораў выдатнага мініяцюрыста Бахматовіча, а таксама ўражанні ад яго родных мясцін, дзе ён працаваў у маёнтку графа Гюнтэра.

Графічныя аркушы майстра, якія сучаснікі не адрознівалі па ўзроўні майстэрства ад прац ягонага прафесара Рустэма — сапраўды выдатныя. Разпораз яны глядзяцца як жывыя замалёўкі да побытавых карцін — столькі ў іх непасрэднай праўды штодзённага жыцця Вільні, ваколіц, маёнткаў, сялянскіх асяродкаў.

▸ КОНКУРС

# ВЕРЫЦЬ ТОЛЬКІ ВЕТРУ

Генадзь КЕСНЕР

**Дакументальная стужка беларускага рэжысёра Віктара Корзуна «Верыць толькі ветру (Чарнобыль — 20 год пасля)» атрымаў першы прыз як лепшы кароткаметражны і малабюджэтны фільм на Міжнародным фестывалі экалагічнага кіно ў горадзе Вааса (Фінляндыя).**

У фінальнай частцы конкурсу ўзялі ўдзел каля 200 стужак з 49 краінаў свету. У журы ўваходзілі вядомыя майстры на чале са Свенам Янсанам (Швецыя) — прызнаным мэтрам «экалагічнага» кіно.

«Усе ведаюць гісторыю Чарнобыля, але ніхто не ведае, што менавіта зараз адбываецца там, у «зоне», — адзначае аўтар фільма-лаўрэата. — Навукоўцы, якія маглі б вывучаць стан рэчаў, проста не маюць туды доступу, каб адкрыта займацца доследам. Ім не даюць ніякіх вымярэнняў, ды, па вялікім рахунку, іх там і не робяць. Усе людзі, якія жывуць у тых мясцінах, проста не хочуць ведаць, што там адбываецца: чалавек, які жыве побач з пагрозай, такім чынам проста псіхалагічна абараняецца. Навошта, каб увесь час у галаве сядзела, што тут выпраменьваецца смяротная доза? Якое ж гэта жыццё? Гэта асобны феномен».

У фільме практычна няма аўтарскага тэксту. «Мы, як аўтары, самі не гаварылі пра штосьці, а толькі паказвалі, што ёсць, як паводзяць сябе людзі, якая ёсць супярэчлівасць у іх словах, — кажа Віктар Корзун. — Мы ўзялі праваднiка-«сталкера», паехалі з пачатку ў трыццацікіламетровую, пасля ў дзесяцікіламетровую зону, знялі рэальнае жыццё з успамінамі і разважаннямі нашай гераіні, якая працуе там дазіметрысткай, але і сама не хоча ведаць поўную праўду».



Па словах аўтара фільма, у чарнобыльскай зоне сапраўды адбываюцца рэчы, якія цяжка ці нават не магчыма патлумачыць. «Там увесь час падалі нейкія метэарыты, цяпер з'яўляюцца нейкія новыя грыбы, расліны, нейкія чорныя бярозы, якіх раней ніколі не было, сама радыяцыя то ўзнікае, то прападае — дзіўныя рэчы там робяцца, — адзначае рэжысёр. — Калісьці я вызнаваў для сябе: самае страшнае ў «зоне», — гэта тое, што сапраўды ніхто рэальна не ведае, што там насамрэч дзеецца».

Раней фестываль у фінскім Вааса праводзіўся раз на два гады, але цяпер, паводле Віктара Корзуна, паступае столькі заявак і стужак, што арганізатары вырашылі ладзіць гэтую імпрэзу штогод.

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 17 сакавіка 2007.

**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.

**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html

**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет». Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 5.12.2008. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.

Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.